Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

# ВЫВУЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 3 КЛАСЕ

Мінск 2020

УДК 811.161.3
ББК 81.2Беи
В92

Рэкамендавана Рэдакцыйна-выдавецкай камісіяй
дзяржаўнай установы адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

С к л а д а л ь н і к
***В. І. Сакалова,*** метадыст вучэбна-метадычнага аддзела дашкольнай
і пачатковай адукацыі Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі

Р э ц э н з е н т ы:
***Р. П. Ільіна,*** старшы выкладчык кафедры прыватных методык агульнай
сярэдняй адукацыі Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі;
***Я. І. Кілбас,*** настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА «Гімназія г. Фаніпаля» Дзяржынскага раёна

В92 **Вывучэнне** новага матэрыялу на ўроках беларускай мовы ў 3 класе / склад. В. І. Сакалова ; ДУА «Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі». – Мінск : Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі, 2020. – 80 с.
ISBN 978-985-7118-95-3.

У зборніку прадстаўлены планы-канспекты ўрокаў беларускай мовы ў 3-м класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія адпавядаюць абноўленай вучэбнай праграме. Матэрыялы распрацовак творчай групы настаўнікаў пачатковых класаў дапамогуць педагогам арганізаваць вучэбна-пазнавальную дзейнасць малодшых школьнікаў на ўроках вывучэння новага матэрыялу. Падабраныя заданні спрыяюць удзелу вучняў у пастаноўцы мэты і задач урока, выклікаюць іх цікавасць і садзейнічаюць развіццю маўленчай дзейнасці і пазнавальнай актыўнасці.

Адрасавана настаўнікам пачатковых класаў, якія выкладаюць беларускую мову ў 3-м класе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

**УДК 811.161.3**
**ББК 81.2Беи**

**ISBN 978-985-7118-95-3**

© Мінскі абласны інстытут
развіцця адукацыі, 2020

**Змест**


Уводзіны…………………………………………………………………. 4
Прыметы тэксту *(Дубатоўка І. І.)*………………………………… 6
Спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце *(Дубатоўка І. І.)*………. 8
Спосабы раскрыцця адной тэмы ў розных тэкстах. Сачыненне па пачатку і серыі малюнкаў *(Дубатоўка І. І.)*………………… 10
План тэксту *(Дубатоўка І. І.)*…………………………………….. 12
Прыметы сказа *(Галко В. Ч.)*……………………………………….. 14
Тыпы сказаў *(Галко В. Ч.)*……………………………………….. 16
Апавядальныя сказы *(Галко В. Ч.)*……………………………… 19
Пытальныя сказы *(Галко В. Ч.)*………………………………….. 22
Пабуджальныя сказы *(Свяцкая Г. А.)*……………………………... 25
Клічныя сказы *(Свяцкая Г. А.)*……………………………………… 28
Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа *(Свяцкая Г. А.)*……….. 30
Даданыя члены сказа *(Свяцкая Г. А.)*…………………………… 32
Значэнне слова *(Невяроўская І. В.)*………………………………… 34
Адназначныя і мнагазначныя словы *(Невяроўская І. В.)*………….. 36
Прамое і пераноснае значэнне слова *(Невяроўская І. В.)*………… 40
Прыстаўка *(Сакалова В. І.)*……………………………………… 43
Апостраф у словах з прыстаўкамі *(Данкевіч Т. В.)*……………….. 47
Напісанне прыставак і прыназоўнікаў *(Данкевіч Т. В.)*…………... 49
Суфікс *(Данкевіч Т. В.)*………………………………………… 51
Агульнае паняцце пра самастойныя і службовыя часціны мовы *(Бурко А. А.)*……………………………………………………… 53
Назоўнік як часціна мовы *(Бруцкая Н. А.)*………………………… 57
Адзіночны і множны лік назоўнікаў *(Бруцкая Н. А.)*……………... 60
Прыметнік як часціна мовы *(Сазонова В. У.)*……………………... 62
Змяненне прыметнікаў па родах *(Сазонова В. У.)*………………... 65
Дзеяслоў як часціна мовы *(Жылко А. У.)*…………………………... 67
Адзіночны і множны лік дзеясловаў *(Жылко А. У.)*……………… 70
Час дзеясловаў *(Жылко А. У.)*…………………………………... 72
Правапіс не з дзеясловамі *(Бурко А. А.)*………………………… 74
Спіс выкарыстаных крыніц……………………………………… 77

# Уводзіны

Зборнік змяшчае выбраныя ўрокі вывучэння новага матэрыялу па беларускай мове ў 3-м класе агульнай сярэдняй адукацыі. Змест урокаў суадносіцца з вучэбным дапаможнікам В. І. Свірыдзенка «Беларуская мова. 3 клас» (2017 г.) для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (у дзвюх частках) і прыкладна-тэматычным планаваннем па беларускай мове для 3-га класа.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да рэалізацыі сучасных дыдактычных падыходаў пры праектаванні і правядзенні вучэбных заняткаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі настаўніку неабходна хутка арыентавацца ў розных педагагічных тэхналогіях, выбіраючы найбольш аптымальныя прыёмы і метады, разнастайныя формы работы, і прытрымлівацца рэкамендацый Інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі ў 2019/2020 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі», зацверджанага намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 10.07.2019. Так, у раздзеле «Планаванне па вучэбным прадмеце. Вядзенне планавай і ўлікова-справаздачнай дакументацыі» пералічаны магчымыя структурныя элементы паўрочнага планавання: тэма ўрока, тып урока, арганізацыйная форма правядзення ўрока, мэты і задачы ўрока, абсталяванне, якое выкарыстоўваецца на ўроку, апісанне дзейнасці настаўніка і вучняў, дамашняе заданне. Таму прапанаваныя планы-канспекты прыведзены прыблізна да аднолькавай паэтапнай традыцыйнай структуры ўрока, якая ўтрымліваецца ў змесце розных педагагічных тэхналогій і аб'ядноўвае па сэнсе разнастайныя падыходы да навучання. У кожным канспекце зроблена спроба вызначыць мэту і задачы ўрока згодна існуючым рэкамендацыям Інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: «Пры пастаноўцы мэты вучэбных заняткаў варта арыентавацца на задачы вывучэння вучэбнага прадмета і на асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, вызначаныя ў вучэбнай праграме» [1, с. 11]. Парадак размяшчэння распрацовак урокаў адпавядае тэмам існуючага прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання.

Творчай групай настаўнікаў пачатковых класаў таксама зроблены акцэнт на стварэнне вучэбных сітуацый на этапе актуалізацыі ведаў і ўменняў, які ў большай ступені матывуе вучняў на сумесную дзейнасць па пастаноўцы задач урока, спрыяе паспяховаму супрацоўніцтву адпаведна тэорыі вучэбнай дзейнасці, стваральнікамі якой лічацца В. В. Давыдаў і Д. Б. Эльконін. Выкарыстанне праблемнай сітуацыі на ўроку беларускай мовы ўплывае на развіццё ў вучняў самастойнасці ў пастаноўцы і вызначэнні рашэння задач, а таксама спрыяе станоўчаму жаданню вывучаць беларускую мову.

Прапанаваныя планы-канспекты з'яўляюцца своеасаблівым прыблізным узорам урока, які адпавядае сучасным падыходам да выкладання беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Змест падабраных

настаўнікамі заданняў павялічвае лексічны запас вучняў, пашырае магчымасці назірання за лексіка-граматычнымі асаблівасцямі беларускай мовы, некаторыя заданні можна выкарыстоўваць з дапамогай электронных сродкаў навучання.

Урокі вывучэння новага матэрыялу не прадугледжваюць абавязковай наяўнасці этапа праверкі дамашняга задання.

Фізкультхвілінкі (зрокавая і рухальная) праводзяцца згодна рэкамендацыям санітарных нормаў і правіл, логіцы зместу ўрока, таму для памяншэння тэкставага зместу зборніка пазначаны ў распрацоўцы кожнага ўрока толькі адзін раз.

У структурнай частцы ўрока «Абсталяванне» пазначаны толькі дыдактычны матэрыял і тэхнічныя сродкі навучання, што спецыяльна трэба падрыхтаваць настаўніку для эфектыўнага правядзення ўрока.

На этапе падвядзення вынікаў урокаў выкарыстоўваюцца некаторыя заданні з дапаможніка для настаўнікаў серыі «Кампетэнтнасны падыход» (Беларуская мова. 3 клас). Этап рэфлексіі можа сумяшчацца з этапам падвядзення вынікаў урока.

Выбар дамашняга задання арыентаваны на дзеючыя вучэбныя праграмы, метадычныя рэкамендацыі і санітарныя нормы і таму супадае са зместам падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, у якіх практыкаванні і заданні для выканання дома пазначаны сігналамі-сімваламі.

Падабраныя заданні ў зборніку спрыяюць актыўнаму ўдзелу вучня ў пастаноўцы мэты і задач урока, робяць яго супрацоўнікам у групавой рабоце над заданнем, заахвочваюць да самастойнага авалодання ведамі, дазваляюць фарміраваць агульнавучэбныя ўменні і навыкі, садзейнічаюць развіццю моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай кампетэнцый на ўроках беларускай мовы.

Зборнік павінен зацікавіць настаўнікаў пачатковых класаў, якія жадаюць павысіць эфектыўнасць правядзення вучэбнага занятка па беларускай мове. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій, актыўных метадаў і форм навучання на ўроку эфектыўна ўплываюць на фарміраванне ў вучняў станоўчай матывацыі да самастойнага вывучэння беларускай мовы, а таксама дапамагаюць пашыраць і развіваць прафесійныя кампетэнцыі настаўніка пачатковых класаў у рэалізацыі сучасных дыдактычных падыходаў пры праектаванні і правядзенні вучэбных заняткаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Пры гэтым трэба адзначыць, што поспех урока для вучняў пачатковых класаў у большасці залежыць ад асобы педагога, таму педагогіка супрацоўніцтва павінна прысутнічаць на кожным уроку.

***Дубатоўка Іна Іванаўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Сярэдняя школа № 9 г. Жодзіна»*

# Прыметы тэксту

***Мэта:*** сістэматызацыя ведаў вучняў пра тэкст, яго прыметы.
***Задачы:***
- узнавіць і замацаваць веды вучняў пра тэкст;
- выпрацоўваць уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту;
- практыкавацца ва ўменні падбіраць загаловак да тэксту і прагназіраваць змест тэксту па загалоўку;
- развіваць інтанацыйныя навыкі, вуснае звязнае маўленне, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў;
- садзейнічаць выхаванню добразычлівасці, гуманных адносін да людзей.

***Абсталяванне:*** выявы вялікага грыба і кошыка (на дошку); контуры грыбоў і карткі з тэкстам (для вучняў).

## *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.** *(На дошцы выява вялікага грыба.)*

– Павярніцеся адзін да аднаго, усміхніцеся. Які настрой выклікае ў вас гэты грыб? Хай добры настрой дапаможа вам адкрыць новыя веды на гэтым уроку.

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**2.1. Параўнанне груп сказаў.**

– Прачытайце і параўнайце дзве групы сказаў.

*На дрэвах пажаўцела лісце. У паветры лётаюць матылькі. У Наташы жоўты алоўак.*

*Пад ялінкай сядзеў стары баравік. Нага яго скрывілася. Шырокая шапка ледзь трымалася.*

– Што вы заўважылі? Як называецца група сказаў, звязаных па сэнсе?

– Чаму будзе прысвечаны наш урок? Якая тэма нашага ўрока?

**2.2. Чыстапісанне. Арфаграфічная размінка.** *(На дошцы выява вялікага грыба.)*

*Цц Це це Ці ці Ця ця церамок*

*Цімафей зірнуў пад шляпку грыба.*

*Там былі і вусень, і конік, і жучок.*

– У сказе другога радка падкрэсліце арфаграмы. *(Вучань працуе каля дошкі.)* Звярніце ўвагу на наш тэкст і сказы, якія вы запісалі.

– Прачытайце тэкст на картцы.

*Пад ялінкай сядзеў стары баравік. Нага яго скрывілася. Шырокая шапка ледзь трымалася. Цімафей зірнуў пад шляпку грыба. Там былі і вусень, і конік, і жучок.*

– Ці можам мы вызначыць у гэтым тэксце тэму?

**2.3. Работа са схемай «Тэкст»** *(форзац падручніка).*

– На форзацы ў пачатку падручніка (злева) знайдзіце тлумачэнне, што такое тэма. Пра што гаворыцца ў тэксце? *(Пра стары грыб.)* Разгледзьце схему на форзацы. Што яшчэ мы можам вызначыць у тэксце? *(Асноўную думку.)* Прачытайце азначэнне і ўспомніце, як вызначаецца асноўная думка. Якая асноўная думка нашага тэксту.

– Хто здагадаўся, якую казачную назву даў аўтар гэтаму тэксту? *(Церамок.)* Чаму жывёлы змаглі схавацца пад грыбам ад дажджу? А што нам дапамагае добра працаваць і дапаможа вызначыць мэту нашага ўрока? *(Добразычлівыя адносіны і павага адзін да аднаго, ветлівасць.)*

– Назавіце асноўныя паняцці на схеме? *(Тэкст, тэма, асноўная думка, загаловак.)* Давайце паглядзім, ці змогуць гэтыя паняцці знаходзіцца разам, як жывёлы пад грыбам. *(На шляпку грыба прымацоўваецца слова «Тэкст», злева, справа і ўнізе ад грыба – карткі «Тэма», «Асноўная думка», «Загаловак».)*

– Сёння мы будзем вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, вучыцца падбіраць загаловак да тэксту і паназіраем за прыметамі тэксту.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Прагназіраванне зместу тэксту па назве.** *(Тэкст запісаны на дошцы, але адкрыты для чытання толькі загаловак.)*

– Прачытайце загаловак тэксту. *(Залатая восень.)* Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў тэксце? Прачытайце тэкст.

*У залатым убранні стаіць лес. Лёгкі ветрык калыша верхавіны дрэў. Жоўтае лісце мякка падае на зямлю. Павольна плыве белае павуцінне. Прыйшла залатая восень.*

– Што падказаў нам загаловак? *(Тэму.)* Вызначце асноўную думку тэксту. Ці ўказвае загаловак на яе? Які вывад можам зрабіць?

**3.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!»** (с. 21).

– Што мы можам дадаць пра значэнне загалоўка ў тэксце?

**Фізкультхвілінка.**

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Аднаўленне дэфармаванага тэксту** (практ. 35, с. 21).

– Абмяркуйце, у якой паслядоўнасці трэба паставіць сказы, каб атрымаўся тэкст *(работа ў парах).*

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Ці даведаліся мы пра ўсё, што планавалі?

*Пасля станоўчых адказаў настаўнік перамяшчае выяву грыба ўніз дошкі. На дошцы застаецца аснова для кластара «Тэкст».*

– Карыстаючыся словамі-апорамі, раскажыце, што было новым? *(Вучні выходзяць да дошкі і дабудоўваюць сувязі ў кластары стрэлкамі.)*




**VI. Дамашняе заданне.** Самастойна выберыце заданне аднаго з трох узроўняў: узровень 1–6 балаў (практ. 33, с. 20), узровень 2–8 балаў (практ. 37, с. 23), узровень 3–10 балаў (практ. 36, с. 22).

**VII. Рэфлексія.** Звернемся да баравічка. Каля яго стаіць кошык, на партах ляжаць грыбы. На адваротным баку грыба напішыце словы, якія часцей за ўсё сустракаліся на ўроку, і пакладзіце свой грыб у кошык.

## Спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце

***Мэта:*** фарміраванне паняцця пра спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце.
***Задачы:***
- пашырыць уяўленне пра ролю загалоўка ў тэксце;
- выпрацоўваць звязнае вуснае маўленне;
- садзейнічаць выхаванню клапатлівых адносін да людзей.

***Абсталяванне:*** карткі «Тэкст», «Тэма», «Асноўная думка тэксту», «Сказ тэксту», «Загаловак» (на дошку).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**2.1. Гульня «Адкажы на 1, 2, 3».**

– Адказвайце на пытанні хутка, хорам, пасля слоў «1, 2, 3»:
- Некалькі сказаў, звязаных па сэнсе, – *(тэкст).*
- Тое, пра што гаворыцца ў тэксце, – *(тэма).*
- Тое, што хацеў сказаць аўтар, – *(асноўная думка тэксту).*

**2.2. Чыстапісанне. Арфаграфічна-моўная размінка.**

*Дз дз Дзе дзе Дзя дзя Дзю дзю*
*Дзяцел дзюба дзяўбці*

– Якія арфаграмы вы сустрэлі ў гэтых словах? Падкрэсліце іх.

– Адгадайце загадку С. Грахоўскага [5, с. 213] *(на дошцы)*:

*Я на елачку палячу –*
*і галінкі палячу:*
*Дзюба ў мяне доўгая,*
*буду стукаць доўга я. (Дзяцел.)*

– Пастаўце націск у словах, якія пішуцца аднолькава, але маюць розны сэнс. Падкрэсліце словы, якія гучаць аднолькава, але маюць розны сэнс і пішуцца па-рознаму. Растлумачце, што абазначаюць гэтыя словы.

– Ці можна гэтую загадку назваць тэкстам? Дакажыце. А чаму не? *(Сказы звязаны па сэнсе, асноўная думка ёсць, але незразумела, пра каго ідзе размова.)*

– Хто паляцеў на елачку? Вызначце тэму тэксту. Чаму дзяцел паляцеў на дрэва? *(Хоча дапамагчы дрэву.)* Якая асноўная думка тэксту? *(Дзяцел будзе лячыць усе галінкі елкі.)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Работа са схемай (кластарам)** *(на дошцы).*

– У якім сказе заключаецца асноўная думка? Назавіце яго. *(На дошцы па ходу гутаркі прымацоўваюцца карткі «Асноўная думка тэксту», потым «Сказ тэксту», «Загаловак».)*




– А як у прыродзе на самой справе адбываецца? *(Дзяцел здабывае сабе ежу і адначасова дапамагае дрэвам.)*

– А людзі так паступаюць? *(Людзі могуць па жаданні клапаціцца пра другіх, а ў сям'і – выконваюць свой абавязак.)*

– Як вы думаеце, ці можна загадку ператварыць у верш, не мяняючы словы ў тэксце? *(Трэба даць загаловак.)*

– Якую назву можна даць вершу? *(«Дзяцел», «Лясны доктар», «Лясная птушка».)* Ці можна сказаць, што ў загалоўку выказваецца асноўная думка тэксту? (*Дадаецца картка «Загаловак».)*

**Фізкультхвілінка.**

**IV. Замацаванне вывучанага на ўроку.**

**4.1. Вызначэнне асноўнай думкі і суаднясенне яе з загалоўкам** (практ. 39, с. 24. (*работа ў парах)).*

– Вызначце асноўную думку і суаднясіце яе з загалоўкам. Запішыце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту.

– Навошта гаспадар знарок пасеяў гарох пры дарозе? (*Хацеў зрабіць людзям прыемнае, каб яны маглі адпачыць і падсілкавацца. Ён быў добры чалавек, клапатлівы.)*

**4.2. Выкананне практыкавання 40, с. 25.**

– У якім сказе выражаецца асноўная думка верша? Як думаеце, хто будуе жыллё для Бобіка? *(Гаспадар. Сам Бобік. Аўтар.)* Растлумачце свой адказ. Запішыце верш.

– Прырода паклапацілася пра жывёльны і раслінны свет, пра чалавека. Але людзям, як істотам разумным, каб забяспечыць сваё існаванне і працяг жыцця на Зямлі, трэба дапамагаць адзін аднаму, клапаціцца аб сваіх блізкіх, даглядаць хатніх жывёл, не парушаць гарманічныя адносіны ў прыродзе.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

**5.1. Выкананне практыкавання 38, с. 23.**

– Запішыце назвы агародніны ў алфавітным парадку. Прачытайце і запомніце правільнае ўжыванне слоў рубрыкі «Гаварыце правільна!».

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 42, с. 26.

– Звярніце ўвагу на ўжыванне ў мове назваў ягад і кустоў: суніцы, чарніцы (мн. лік) – ягады; каліна, маліна (адз. лік) – кусты.

**VII. Рэфлексія «Прадоўжы сказ».**

Я даведаўся…

Я навучыўся…

Я хачу больш даведацца…

## Спосабы раскрыцця адной тэмы ў розных тэкстах. Сачыненне па пачатку і серыі малюнкаў

***Мэта:*** фарміраванне ўяўлення пра спосабы раскрыцця адной тэмы ў тэкстах розных стыляў і жанраў.

***Задачы:***

- практыкаваць у вызначэнні адзінай тэмы ў тэкстах розных стыляў і жанраў;
- выпрацоўваць уменне ствараць уласны тэкст па серыі сюжэтных малюнкаў;
- развіваць маўленчыя навыкі, творчыя здольнасці вучняў;
- садзейнічаць выхаванню эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам, папяровыя лісцікі дрэў (для вучняў), выявы жоўтай, аранжавай, чырвонай ваз (на дошку).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Моўная размінка.**

– Прачытайце і адгадайце загадку С. Шушкевіча *(на дошцы).*

*З галінкі збіты ветрам*
*Ён на зямлю не лёг,*
*А кружыцца ў паветры,*
*Як жоўты матылёк. (Восеньскі ліст.)* [35]

– Пра якую пару года ідзе размова ў загадцы? *(Восень.)* Чаму? Ці можна гэту загадку назваць тэкстам? Дакажыце.

**3.2. Чыстапісанне.**

*Вв Во во*

*восень восеньскі*

*На, мякка, восеньскае, зямлю, лісце, падае.*

– У нас сёння новае слоўнікавае слова ***восеньскі.*** Пастаўце націск, падзяліце слова ў другім радку на склады, палічыце гукі і літары. Што заўважылі? Якія арфаграмы трэба запомніць? Са слоў трэцяга радка складзіце сказ, запішыце. *(Мякка падае на зямлю восеньскае лісце.)* З якой парой года звязаны сказ?

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне задання па картках.**

– Сёння мы будзем не толькі гаварыць пра восень, але і:

*даказваць…*

*вызначаць…*

*параўноўваць…*

– Уважліва прачытайце тэкст на картках.

*Калі хочаш паглядзець залатую восень, зазірні ў лес. Дрэвы захутаны ў белыя цёплыя футры. Пачырванела рабіна. Бярозкі апранулі свае жоўтыя сарафаны. Заквітнела чаромха. Дубы пакрыліся карычневай бранёй. І толькі ялінкі стаяць у сваім зялёным убранні. Шамаціць пад нагамі апалае сухое лісце. З-пад лісця прабіваецца тонкая беленькая пралеска.*

*Добра восенню ў лесе!*

– Што заўважылі? *(Лішнія сказы.)* Закрэсліце лішнія сказы і перачытайце атрыманы тэкст.

– Прачытайце другі тэкст.

*Восень – адна з чатырох пораў года паміж летам і зімой. Восень – пераходны сезон, калі прыкметна памяншаецца светлавы дзень і паступова паніжаецца тэмпература навакольнага асяроддзя.*

– Дакажыце, што гэта тэксты. Чым яны падобны? *(Адна тэма, апісваецца восень.)* Ці можна ў адным творы сустрэць адразу гэтыя тэксты? Дзе можна сустрэць? *(Мастацкая кніга, энцыклапедыя.)*

**V. Замацаванне вывучанага на ўроку.**

**5.1. Выкананне практыкавання 43 (с. 27)** *(Работа ў групах.)*

– Якой тэмай аб’яднаны тэксты? Дзе такія тэксты можна сустрэць?

**Фізкультхвілінка.**

**5.2. Сачыненне па пачатку і серыі малюнкаў** (практ. 45, с. 28). *(Прагназіраванне зместу будучага тэксту.)*

– Прачытайце назву і пачатак апавядання. Як вы думаеце, пра што будзе тэкст?

*Складанне сказаў па малюнках і пытаннях, запіс іх у сшытку.*

– Куды заглянуў адзін цікаўны лісток? Што зрабілі дзеці і настаўніца? Куды заглянула восень?

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Вернемся да нашай мэты ўрока і працягнем выказванні.

*Даказваць…*

*Вызначаць…*

*Параўноўваць…*

**VII. Рэфлексія «Восеньскі букет».** Прымацуйце лісцік да пэўнай вазы: жоўтая ваза – усё зразумела; аранжавая ваза – у асноўным зразумела, але ёсць пытанні; чырвоная ваза – ёсць цяжкасці.

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 46, с. 29.

# План тэксту

***Мэта:*** фарміраванне ўмення складаць план тэксту.
***Задачы:***
- пазнаёміць з паняццем «план тэксту»;
- практыкаваць у складанні плана тэксту пры дапамозе пытальных і апавядальных сказаў;
- выпрацоўваць маўленчыя навыкі і звязнае вуснае маўленне;
- садзейнічаць выхаванню станоўчых адносін да працы.

***Абсталяванне:*** карткі са сказамі (для дошкі) або мультымедыйная ўстаноўка з выхадам у інтэрнэт; тэст (для вучняў).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

Дружна ўсе за парты селі.
На мяне ўсе паглядзелі.
Слухаем, запамінаем,
ні хвілінкі не губляем.

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Чыстапісанне. Арфаграфічная размінка.**

*Кк іі іў кі ок оі кл*
*восеньскі свята песня*
*рэчкай, раслі, за, адны, елкі.*

– Абазначце арфаграмы ў словах другога радка. Якое слова лішняе? Чаму? *(Восеньскі – мяккасць зычнага абазначана мяккім знакам.)* Складзіце сказ з дадзеных слоў у трэцім радку і запішыце яго.

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Складанне дэфармаванага тэксту.**

Ссылка на інтэрактыўнае заданне:
https://learningapps.org/display?v=poh5j69ft18
(Сказы можна размясціць на картках.)

*За рэчкай раслі адны елкі. Але потым сярод іх з’явіліся дубкі. Яшчэ зусім маленькія. Хто пасадзіў іх тут? Сойка на зіму схавае жолуд. А вясной жолуд прарасце.*

– Што мы склалі? *(Тэкст.)* Як вы вызначылі, што гэта тэкст? Аб чым гаворыцца ў тэксце? Вызначце яго тэму. Якая галоўная думка тэксту? Падбярыце загаловак. На што ён указвае: на тэму ці асноўную думку? Давайце ўспомнім дзеянні, якія мы выконвалі? *(Звязвалі сказы па сэнсе. Знаходзілі, аб чым гаворыцца ў тэксце. Вызначалі галоўную думку тэксту. Падбіралі загаловак.)*

– Мы з вамі выконвалі дзеянні па алгарытме, складалі **план.** Пра што будзем гаварыць на ўроку? **Што** будзем рабіць? **Як** мы гэта будзем рабіць? **Для чаго**?

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Суаднясенне назвы загалоўка з асноўнай думкай тэксту (практ. 47, с. 29).** *(Работа ў парах.)*

– Суаднясіце назву загалоўка з асноўнай думкай тэксту. На што ўказвае загаловак тэксту?

**5.2. Выкананне практыкавання 48, с. 30.** *(Работа ў групах.)*

– Падзяліце тэкст на часткі з апорай на серыю малюнкаў. Падбярыце загалоўкі да кожнай часткі. Запішыце план з дапамогай апавядальных сказаў. *(Узаемаправерка.)*

**Фізкультхвілінка.**

**5.3. Выкананне тэста.**

1. Выберыце групы сказаў, якія можна назваць тэкстам.

*а) Лета дзіўна багата пахамі. Лісце пакрываюць зямлю лёгкім дываном. Вясновае сонца свеціць ярка.*

*б) Голадна восенню пералётным птушкам. Толькі драздам добра. Яны паляцелі на ягады спелай рабіны.*

*в) На паляне стаяла стройная бярозка. Каля ручая растуць блакітныя незабудкі. Хутка прыйдзе халодная зіма.*

2. Прачытайце тэкст. Колькі ў ім сказаў?

*Паднялася за ракой цёмная хмара заграмыхаў гром пранёсся па верхавінах дрэў віхор закачаліся дрэвы закруцілася над палянай лісце ўпалі першыя кроплі дажджу*

*а) 6 сказаў;*

*б) 7 сказаў.*

3. Асноўная думка тэксту – гэта:

*а) тое, што змог пераказаць вучань;*

*б) тое галоўнае, што хацеў сказаць аўтар;*

*в) тое, што кажа галоўны герой у тэксце.*

4. Тое, аб чым расказваецца ў тэксце, называецца:

*а) тэмай тэксту;*

*б) асноўнай думкай тэксту;*

*в) абзацам.*

5. Выберы загаловак да гэтага тэксту:

*На лугах завялі травы. З дрэў ападае лісце і мяккім дываном лажыцца на зямлю. Дзьме лёгкі ветрык. Птушкі збіраюцца ў стаі і рыхтуюцца да адлёту. Холадна.*

*а) Прыйшла восень.*

*б) Восеньскі дзень.*

*в) Залатая восень.*

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 49, с. 31.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– **Што** сёння рабілі?

– **Як** мы гэта рабілі?

– **Для чаго**?

***Галко Вольга Чаславаўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Вілейкі»*

# Прыметы сказа

***Мэта:*** абагульненне паняцця «сказ» як сінтаксічнай адзінкі мовы.
***Задачы:***
- выпрацоўваць уменне будаваць сказы з прапанаванага набору слоў, вызначаць межы сказаў у тэксце, знаходзіць сказы сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў;
- развіваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне;
- выхоўваць любоў да Радзімы;
- выклікаць жаданне прытрымлівацца здаровага ладу жыцця.

***Абсталяванне:*** карткі з запіскай Стасіка (для вучняў); карткі для работы ў парах.

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

– Усміхніцеся адзін аднаму. Падарыце і мне свае ўсмешкі. Дзякуй вам! Усмешка спрыяе наладжванню добразычлівых прыемных зносін і супрацоўніцтву. Спадзяюся, што сёння мы будзем працаваць з задавальненнем.

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Моўная размінка.**

Жыве, працуе мой народ
Ці ў снежань, а ці ў май,
І харашэе з году ў год
Мой родны, вольны край.

Куды ні глянь – лясы шумяць,
За полем рэчка, гай.
І ў сэрцы *песні* не стрымаць
Пра мой любімы край. *(А. Русак)* [25].

– Выразна прачытайце верш. Дакажыце радкамі верша, што аўтар любіць свой край? Як вы разумееце выраз «у сэрцы песні не стрымаць»?

**3.2. Чыстапісанне.**

*Пп сн сп пе пя*

*песня пес-ня пе-сня*

– На дошцы запіс гучання слова «песня»: *[пэсна],* знайдзіце памылкі ў запісу і выправіце *([п’эс’н’а].)* Як абазначана на пісьме мяккасць гэтых гукаў? Чаму гэта слова вызначылі слоўнікавым? Падбярыце роднасныя словы да слова *песня. (Песенька, спеў, пясняр, спявак, спявачка, пяюн, пяюха.)*

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Работа з дэфармаваным тэкстам** *(на картках).*

– Сёння мы пазнаёмімся з новым раздзелам падручніка. А вось з якім, даведаецеся, калі прачытаеце адну гісторыю *(на картцы)*:

*Стасік прыйшоў дамоў са школы і ўбачыў на сваім камп'ютары паведамленне ад сябра Паўліка. Яго сёння не было на занятках. Вось што ён напісаў:* «учора дзьмуў халодны вецер увесь дзень ліў моцны дождж у мяне не было парасона я ішоў са школы і прамок сёння я захварэў мне сумна прыходзь да мяне». *Стасік прачытаў ліст, але нічога не зразумеў.*

– Як вы лічыце, ці можна зразумець, што напісаў Паўлік сябру? *(Вучні далей працуюць з паведамленнем Паўліка на картцы.)* Што трэба зрабіць, каб зразумець, аб чым ідзе размова? *(Трэба падзяліць тэкст на сказы.)*

– Падзелім тэкст на сказы. Колькі сказаў атрымалася? Якія знакі прыпынку трэба паставіць у канцы сказаў? Вы, напэўна, ужо здагадаліся, якая тэма нашага ўрока?

– Мы будзем вывучаць раздзел «Сказ». Якая мэта нашага ўрока? Якія задачы паставім для сябе на ўроку? *(Вучні прапануюць фармулёўкі мэты і задач урока.)*

**4.2. Выкананне практыкавання 60, с. 40.** *(Работа ў парах.)*

– Прачытайце тэкст. Вызначце межы сказаў. Падлічыце колькасць сказаў у тэксце. Што выражаецца ў кожным сказе? Прачытайце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту. Як трэба правільна афармляць сказы на пісьме? Запішыце гэты сказ.

**Фізкультхвілінка.**

**4.3. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 40).**

– Прачытайце інфармацыю і адкажыце, што такое сказ.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 61, с. 40.**

– Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў сказы. Па якіх прыметах вы вызначылі сказы? Што трэба зрабіць, каб астатнія спалучэнні слоў ператварыць у сказы? Вусна складзіце сказы. Якія сказы ў вас атрымаліся?

– Якія правілы работы за камп'ютарам вы ведаеце? Ці заўсёды вы выконваеце гэтыя правілы? Чаму нельга парушаць іх?

**5.2. Выкананне практыкавання 62, с. 41.**

– Прачытайце сказы і назавіце тыя, у якіх допушчаны сэнсавыя памылкі. Выпраўце іх і запішыце сказы правільна. *(Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія – у сшытках.)*

– З асобных слоў практ. 63 (с. 41) складзіце і запішыце прыказкі. Растлумачце сэнс прыказак. Чаму так гавораць?

**5.3. Выкананне практыкавання 64, с. 42.** *(Работа ў парах.)*

– Складзіце сказы па пачатку, улічваючы апісаную маўленчую сітуацыю. Выразна прачытайце сказы, якія ў вас атрымаліся.

– Паспрабуйце скласці працяг размовы, пачатак якой апісваецца ў сітуацыі. Разыграйце размову мамы і дзіцяці.

**5.4. Вызначэнне межаў сказаў у тэксце** *(работа ў парах)*.

– Правільна аформіце сказы на картках *(узаемаправерка)*:

*у асінцы ёсць дупло летась у ім стракаты дзяцел жыў вясной хлопчык вырашыў наведаць дзятлаву сям'ю пастукаў па дрэве але з дупла вылез не дзяцел тут жыла круцігалоўка дзятлы двойчы не селяцца ў адным дупле.*

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 65, с. 42. Вызначце межы сказаў. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і правільна афармляючы сказы на пісьме.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Злучыце часткі выказванняў:

| | |
|---|---|
| *Сказы складаюцца ...* | *па сэнсе.* |
| *Сказ выражае ...* | *ставіцца кропка.* |
| *Словы ў сказе звязаны ...* | *закончаную думку.* |
| *У канцы сказа ...* | *са слоў.* |

## Тыпы сказаў

***Мэта:*** азнаямленне з рознымі тыпамі сказаў па мэце выказвання.

***Задачы:***

- выпрацоўваць уменне распазнаваць і адрозніваць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы ў тэксце і на слых;
- развіваць інтанацыйныя навыкі, узбагачаць слоўнікавы запас словамі групы «музычныя інструменты», развіваць вуснае звязнае маўленне;
- садзейнічаць выхаванню станоўчых адносін да музыкі.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі (для работы ў групах); схема «Віды сказаў па мэце выказвання» (на дошцы); малюнкі (фотаздымкі) тэатраў Беларусі; аўдыёзапіс гучання флейты; карткі са словамі *(пяшчотныя, мяккія, ласкавыя, лагодныя, чароўныя, трывожныя, рэзкія, моцныя, мелодыя, скрыпка, матыў, флейта, напеў, аркестр, тэатр)*; адказы лікавага дыктанта.

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

*Празвінеў і змоўк званок,*
*Ён сабраў нас на ўрок.*
*Слухаем, запамінаем,*
*Ні хвілінкі не губляем.*

– Якім вы бачыце сённяшні ўрок? З якім настроем прыйшлі на ўрок?

**II. Праверка дамашняга задання.**

– Як называецца тэкст у дамашнім практыкаванні? Чаму тэксту далі такую назву? Колькі сказаў у тэксце? Якія прапушчаныя літары вы ўставілі ў словы? Якім правілам карысталіся?

**III. Моўная размінка.** Урывак з верша «Чыя музыка грае?» Веры Бурлак чытае настаўнік.

| | |
|---|---|
| *Чыя музыка грае?* | *Музыка гадзінаў…* |
| *Музыка ветру.* | *Калі сяджу я,* |
| *Заспявала птушка –* | *Калі маўчу я?* |
| *Музыка птушкі.* | *Грае мая музыка.* |
| *Ідзе гадзіннік –* | *Шкада, ніхто не чуе!* [9, с. 12] |

– Якую музыку чуе аўтар? Як вы разумееце выраз: «Грае мая музыка. Шкада, ніхто не чуе!»? Якую музыку любіце слухаць вы?

**IV. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**4.1. Чыстапісанне.**

*Тт тр тэ*

*музыка аркестр тэатр*

*Тэатр – цудоўны свет мастацтва.*

– Хто з вас хоць раз быў у тэатры? Ці спадабалася вам там? Чаму слова «тэатр» лічыцца слоўнікавым словам? Па якіх прыметах можна адрозніць сказ ад набору слоў? *(Сказ выражае закончаную думку. Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары, у канцы ставіцца кропка, пытальнік або клічнік. Пры вымаўленні голас паніжаецца ў канцы сказа.)*

**V. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне задання па картках.***(Работа ў групах.)*

– Групы 1 і 2 складаюць невялікае паведамленне пра тэатр з 4-5 сказаў:

*Тэатр – гэта месца, дзе можна … .*

*Тэатр – гэта чароўная краіна, дзе … .*

– Групы 3 і 4 складаюць пытанні для апытальніка:

*Ці падабаецца вам … ?*

*Колькі разоў вы былі … ?*

*Якія тэатры вы … ?*

*Які тэатр для вас … ?*

*Ці наведваюць тэатр вашы … ?*

*Што неабходна рабіць для таго, каб людзі наведвалі … ?*

– Групы 5 і 6 складаюць правілы паводзін у тэатры:

*Паважайце …!*

*Не парушайце …!*

*Прыходзьце ў … своечасова!*

*Заўсёды будзьце …!*

*Заўсёды выконвайце …!*

*Будзьце ўдзячны ўсім …!*

– Звярніце ўвагу на сказы, якія ў нас атрымаліся. Скажыце, якая мэта кожнай групы сказаў? *(1 і 2 – расказаць пра тэатр, 3 і 4 – задаць пытанні, 5 і 6 – прапанаваць правілы.)*

– Ці аднолькавыя гэтыя сказы па свайму тыпу? *(Не.)* Чым адрозніваюцца сказы адзін ад аднаго ў кожным тэксце? (*У іх розная*

*мэта.)* Хто здагадаўся, як будзе гучаць тэма нашага ўрока? *(Тыпы сказаў па мэце выказвання.)* Якія задачы мы паставім перад сабой? Пра што нам трэба даведацца? Чаму навучыцца?

– Ці можам мы пералічыць тыпы сказаў? Якія гэта сказы? Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы кожнага сказа?

*Тыпы сказаў па мэце выказвання*

| ↙ | ↓ | ↘ |
| --- | --- | --- |
| *паведамленне* | *пытанне* | *просьба, прапанова, загад* |
| ↓ | ↓ | ↓ |
| *апавядальны* | *пытальны* | *пабуджальны* |
| ↓ | ↓ | ↓ |
| *кропка* | *пытальнік* | *кропка, клічнік* |

**Фізкультхвілінка.**

**VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**6.1. Выкананне практыкавання 66 (с. 43).**

– Прачытайце назву тэксту. Што такое флейта? Ці ведаеце вы, як гучыць флейта? Паслухайце гучанне флейты. *(Аўдыёзапіс.)* Якія словы падыходзяць для апісання гукаў флейты? *(На дошцы словы: пяшчотныя, мяккія, моцныя, ласкавыя, трывожныя, лагодныя, рэзкія, чароўныя.)*

– Разгледзьце малюнак на с. 43. Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў тэксце? Прачытаем тэкст і праверым нашы меркаванні.

– Ці пацвердзіліся нашы меркаванні? Які музычны інструмент зачараваў Ліну? Выразна прачытайце сказ, у якім перадаецца жаданне дзяўчынкі. Які знак прыпынку стаіць у канцы сказа? Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім выражаецца пытанне. Зачытайце адказ на яго. Запішыце сказы. *(Узаемаправерка.)*

**6.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 44).**

– Прачытайце інфармацыю і адкажыце на пытанне, што можа выражацца ў сказе.

**6.3. Работа над лексічным значэннем слова *музы́ка*.**

– Прачытайце выдзеленае слова. Каго называюць муз**ы́**кам? Як інакш можна назваць таго, хто ўмее добра граць на музычным інструменце? *(Музыкант.)* Вымавіце слова *музы́ка* з націскам на іншым складзе, каб змяніўся сэнс слова. *(Му́зыка.)* Падбярыце блізкія па значэнні словы да слова *му́зыка*. *(На дошцы: мелодыя, скрыпка, матыў, флейта, напеў, аркестр, тэатр.)* Прыдумайце сказ са словам *му́зыка*.

**Фізкультхвілінка.**

**6.4. Выкананне практыкавання 67 (с. 44).**

– Выразна прачытайце сказы. У якім сказе выражаецца паведамленне, у якім – пытанне, у якім – пабуджэнне да дзеяння? Разгледзьце схемы да сказаў. Выпішыце пытальны сказ. Вусна адкажыце на пытанне, якое вы запісалі.

**6.5. Работа з правілам на с. 45.**

**6.6. Выкананне практыкавання 68 (с. 45).**

– Прачытайце сказы. Разгледзьце схемы да іх. Якім сказам адпавядаюць дадзеныя схемы? Запішыце сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы. Што атрымалася ў выніку спісвання? *(Тэкст.)* Якую назву можна даць тэксту? *(Сімфанічны аркестр.)*

– Ці слухалі вы музычныя творы ў выкананні сімфанічнага аркестра? Дзе гэта адбывалася? *(У тэатры.)* Гучанне якіх музычных інструментаў вам асабліва запомнілася?

**6.7. Выкананне практыкавання 69 (с. 45).** *(Работа ў парах.)*

– Дапоўніце размову бабулі і ўнука патрэбнымі сказамі па схемах. Разыграйце дыялог у парах. Назавіце ў тэксце пабуджальны сказ.

**6.8. Тэст «Лікавы дыктант».**

– Я буду чытаць сказы, а вы стаўце нумар, які адпавядае тыпу сказа. *(На дошцы: апавядальны сказ – 1, пытальны – 2, пабуджальны – 3).*

– Хто зрабіў урокі?

– Каця, схадзі за журналам.

– Самае лёгкае не ёсць самае добрае.

– Сямёра аднаго не чакаюць.

– Няхай кніга будзе тваім караблём у акіяне ведаў.

– Дзе бы ты ні быў, дзе бы ты ні вучыўся, шукай новае, адкрывай творы!

– Які настрой у вас на далейшую працу? *(Адказы: 2, 3, 1, 1, 3, 3, 2)*

**VII. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

– З якім настроем вы заканчваеце ўрок?

– Колькі ёсць тыпаў сказаў па мэце выказвання? *(Зварот да схемы.)* Якія гэта сказы? Што яны выражаюць? Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы сказаў у залежнасці ад тыпу сказа? Прывядзіце прыклады апавядальнага, пытальнага і пабуджальнага сказаў.

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 69, с. 45. Вусна вызначце тыпы сказаў па мэце выказвання. Выпішыце апавядальныя сказы.

## Апавядальныя сказы

***Мэта:*** азнаямленне з прыметамі апавядальных сказаў, іх афармленнем на пісьме.

***Задачы:***

- выпрацоўваць уменне вылучаць апавядальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх;
- развіваць лагічнае мысленне вучняў;
- выхоўваць уменне бачыць прыгажосць прыроды і фарміраваць беражлівыя адносіны да прыроды роднага краю.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі *(для работы ў групах).*

*Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

– Патрыце далонькі адна аб адну. Закрыйце імі вочкі і ўявіце штосьці прыемнае, пяшчотнае: прыгожую кветку, сонечны праменьчык, ласкавую ўсмешку маці. Адчуваеце, як вам становіцца добра, радасна, спакойна? Вось з такім цудоўным настроем мы і пачнём урок.

**II. Праверка дамашняга задання (практ. 69, с. 45).**

– Якія сказы вы выпісалі пры выкананні дамашняга практыкавання? Што атрымалася ў выніку спісвання? Якую назву можна даць тэксту?

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Моўная размінка.** Верш «Твая Беларусь» *(Ю. Свірка)*

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край,твая Айчына –
Жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла – Беларусь [14, с. 20].

– Ці згодны вы з аўтарам? Чаму? У чым прыгажосць нашай краіны? Знайдзіце словы з блізкім значэннем. *(Радзіма – Айчына, краіна – зямля.)*

**3.2. Чыстапісанне.**

*Б Б б б Бб Бе Бл бу бе*

*бусел белы Беларусь*

*Белы бусел – сімвал Беларусі.*

– Якое слова напісана з вялікай літары? Растлумачце яго правапіс. *(Беларусь – геаграфічная назва, пішацца з вялікай літары.)*

**3.3. Выкананне задання на картках.** *(Работа ў групах.)*

– Што вы ведаеце пра Беларусь? Складзіце з прапанаваных слоў сказы пра Беларусь і запішыце іх у сшытак.

Група 1.

*Краіна, у, Еўропы, наша, цэнтры, знаходзіцца.*

*Літвой, з, Расіяй, яна, Украінай, мяжуе, Польшчай, і, Латвіяй.*

*Мірныя, свеце, беларусы, самыя, і, людзі, працавітыя, у.*

Група 2.

*Многа, на, краіны, лясоў, тэрыторыі, і, пушчаў.*

*Пушча, сапраўдным, Белавежская, музеем, прыроды, жывой, з'яўляецца.*

*Магутны, упрыгожвае, зубр, пушчу.*

Група 3.

*Краіну, «сінявокай», нашу, называюць.*

*Рэкамі, і, яна, багата, азёрамі.*

*Возера, самае, Нарач, вялікае.*

Група 4.

*Называюць, пад, крыламі, белымі, Беларусь, зямлёй, або, буслоў, краінай.*

*На, жывуць, буслы, слупах, нас, у, дамоў, і, дахах, дрэвах.*

*Птушкі, мірныя, яны, і, спакойныя.*

– Якімі сказамі па мэце выказвання вы карысталіся, каб расказаць пра Беларусь і яе прыгажосць? З дапамогай якіх сказаў людзі паведамляюць аб чым-небудзь? Хто здагадаўся, які тып сказаў сёння будзем вывучаць? Як будзе гучаць тэма нашага ўрока? Якія задачы мы паставім перад сабой на ўроку?

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 71 (с. 46).**

– Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы і падумайце, якімі сказамі можна падпісаць кожны малюнак. Растлумачце знакі прыпынку ў канцы кожнага сказа. Знайдзіце і запішыце сказы з прыназоўнікамі. Падкрэсліце іх.

**4.2. Работа над правілам (с. 47).**

**Фізкультхвілінка.**

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 72 (с. 47).**

– Падзяліце тэкст на сказы. Што вы даведаліся пра матыля? З якіх сказаў па мэце выказвання складаецца дадзены тэкст? Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме. *(Узаемаправерка.)*

**5.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 47).**

– Якія ёсць асаблівасці ў вымаўленні апавядальных сказаў? Якія словы ў апавядальных сказах вымаўляюцца з большай сілай голасу?

**5.3. Выкананне практыкавання 73 (с. 48).**

– Зараз мы з вамі папрактыкуемся ў правільным вымаўленні апавядальных сказаў. Прачытайце адзін і той жа апавядальны сказ так, каб ён даваў адказ на тры розныя пытанні. Па стрэлках над словамі сачыце за павышэннем і паніжэннем голасу ў сказе. *(Настаўнік чытае пытальныя сказы, а вучні па чарзе чытаюць апавядальныя сказы ў правільным інтанаванні.)*

– Выразна прачытайце сказы ў парах. Сачыце за правільным інтанаваннем апавядальных сказаў.

**Фізкультхвілінка.**

**VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**6.1. Выкананне практыкавання 74 (с. 48).**

– Прачытайце тры групы сказаў. У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні сказ. Растлумачце свой выбар. Запішыце сказы, якія былі ў групах лішнія. Прачытайце запісаныя сказы. Што яны ўтвараюць? З якіх сказаў складаецца атрыманы тэкст? Дайце назву тэксту.

**6.2. Заданне ад Памылкі Памылкінай.** *(Работа ў парах па картках.)*

– Знайдзіце памылкі ў тэксце. Правільна падзяліце тэкст на сказы.

*Нашу краіну называюць. Азёрным краем у Беларусі. Многа вялікіх рэк і азёр. Самае вялікае Возера нарач на нарачы. Бывае шмат людзей вакол. Шумяць высокія сосны вербалозы. Глядзяцца ў ваду.*

Самастойная праверка задання па ўзоры на дошцы.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Якія сказы называюцца апавядальнымі? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы апавядальных сказаў? Якія ёсць асаблівасці вымаўлення апавядальных сказаў?

**VIII. Дамашняе заданне.**

– Вам неабходна з асобных слоў практ. 75 (с. 49) скласці сказы, запісаць іх, правільна афармляючы на пісьме. Звярніце ўвагу на правільнасць напісання літар «*у – ў*».

**IX. Рэфлексія.** «Мы пачыналі ўрок з цудоўным настроем. Ці захаваўся ў вас добры настрой на працягу ўрока? Што асабліва спадабалася? Чым зацікавіліся?» *(Вучні дзеляцца сваімі пачуццямі.)*

## Пытальныя сказы

***Мэта:*** азнаямленне з прыметамі і афармленнем на пісьме пытальных сказаў.

***Задачы:***

- выпрацоўваць уменне вылучаць пытальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі;
- развіваць лагічнае мысленне вучняў; узбагачаць іх слоўнік словамі-амонімамі;
- выхоўваць любоў да Радзімы.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі (для работы ў парах).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

– Прачытайце сказы, якія ў вас атрымаліся (практ. 75, с. 49). Растлумачце правапіс літар «*у – ў*» у словах. Звярніце ўвагу, што існуе некалькі варыянтаў правільнага складання сказа з прапанаваных слоў.

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Моўна-арфаграфічная размінка.**

– Прачытайце верш Адама Русака, растлумачце правапіс прапушчаных літар. Перачытайце верш два разы, а потым прачытаем яго хорам, выдзяляючы голасам падкрэсленыя словы.

Куды ні глянь – л..сы шумяць,
Цвіце за полем гай.
А поле – вокам не абняць –
І гэта ўсё мой край!

Ж..ве, пр..цуе мой наро.. .
Ці ў снежань, ці ў май,
І х..рашэе з году ў го..
Мой родны вольны край [25].

– Як вы думаеце, якія сказы з дамашняга задання падыходзяць па сэнсе да верша? Вызначце тэму і асноўную думку верша.

– Пералічыце назвы месяцаў, што сустрэліся ў тэксце. Назавіце словы, у якіх не супадае колькасць літар і гукаў.

– Як вы разумееце выраз «вокам не абняць»? *(Вельмі вялікае.)*

– Як называецца наш родны край? *(Рэспубліка Беларусь.)*

**3.2. Чыстапісанне.**

*Рр бр Бр бб*

*Рэспубліка Беларусь беларус беларуская*

– Запішыце словы. Знайдзіце і абазначце ў іх арфаграмы. Успомніце адпаведныя правілы.

*Родная з..мля м..кч..йшая за чужую п..рыну.*

– Запішыце прыказку, устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце яе сэнс. Што вы можаце сказаць пра сказ, які мы запісалі ў сшытку? *(Гэта апавядальны сказ.)* З якой мэтай ўжываюць апавядальныя сказы? Як вымаўляюцца? Як афармляюцца на пісьме?

**3.3. Вызначэнне меж сказаў у тэксце.** (Работа ў парах на картках.)

– Запішыце тэкст, падзяляючы яго на сказы. Пастаўце знакі прыпынку.

*Прыгожы мой родны край на прасторных лугах растуць жоўтыя дзьмухаўцы і духмяны чабор недалёка ад горада цячэ шырокая паўнаводная рака ў яе затоках распускаюцца белыя лілеі і жоўтыя гарлачыкі дзе яшчэ сустрэнеш такую прыгажосць*

– Ці з'яўляецца апошні сказ апавядальным? Як называецца гэты сказ? Які знак прыпынку стаіць у канцы гэтага сказа? Навошта нам патрэбны пытальныя сказы? Хто здагадаўся, які тып сказаў мы будзем вывучаць на сённяшнім уроку? Якая тэма нашага ўрока? Якія задачы паставім перад сабой на ўроку?

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 76 (с. 49).**

– Паслухайце верш. *(Чытае настаўнік.)* Колькі пытанняў у ім?

– Прачытайце пытанні, якія хлопчык задае сабе. Як ён адказвае на іх? А як бы вы адказалі на першае пытанне верша?

– Спішыце выдзеленыя сказы. Вызначце іх тыпы па мэце выказвання. Які знак прыпынку стаіць у канцы пытальнага сказа?

**4.2. Работа з правілам (с. 50).**

– Што выражаецца ў пытальным сказе? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы пытальнага сказа?

**Фізкультхвілінка.**

**4.3. Выкананне практыкавання 77 (с. 50).** *(Работа ў парах.)*

– Выразна прачытайце пары сказаў. Чым падобныя сказы ў парах? Чым яны адрозніваюцца? *(Адзін вучань чытае апавядальныя сказы, а другі – пытальныя. Потым наадварот.)* Спішыце пытальныя сказы.

**4.4. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 50).**

– Звярніце ўвагу, што ў пытальным сказе голас рэзка павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пытанне.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 78 (с. 51).**

– Зараз мы з вамі папрактыкуемся ў правільным вымаўленні пытальных сказаў. Прачытайце пытальны сказ некалькі разоў. Зрабіце гэта так, каб адказам на яго стаў па чарзе кожны з апавядальных сказаў.

Ты паклаў сшытак на стол? Не, гэта зрабіў *Сяргей.*

Ты паклаў сшытак на стол? Не, я паклаў на стол *дзённік.*

Ты паклаў сшытак на стол? Я паклаў сшытак у *рукзак.*

– Як вы здолелі задаць тры розныя пытанні, але выкарысталі ў сказах адны і тыя ж словы? Запішыце сказы са слоўнікавым словам: *Ты паклаў сшытак на стол? Я паклаў сшытак у рукзак.*

**5.2. Слоўнікавая работа.**

– Як правільна трэба вымаўляць слова *сшытак*? *([шшытак], [ш] – падоўжаны.)* Правільна вымавіце слова хорам. Які гук чуецца ў пачатку слова? Якое спалучэнне літар пішацца ў пачатку слова? Чаму пасля літары *ш* пішацца галосны *ы*?

– Запішыце слова *сшытак*. Падкрэсліце спалучэнне літар *сш.*

**5.3. Выкананне практыкавання 79 (с. 51).**

– Прачытайце загадку. Што трэба паставіць у канцы сказа? Назавіце слова-адгадку. *(Вузел.)*

– Растлумачце значэнне слова *вузел.* Звернемся да тлумачальнага слоўніка: 1) Вузел – пятля, сцягнутая на вяроўцы, нітцы; 2) Вузел – адзінка вымярэння хуткасці, роўная адной марской мілі (амаль 2 кіламетры за гадзіну). Адзінка вымярэння «вузел» прымяняецца ў авіяцыі і мараходстве.

– Спішыце загадку. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 80 (с. 51).

– Прачытайце верш. Што выклікала ў вас усмешку? Якія чайнікі пераблытаў герой верша? Неабходна выпісаць з верша пытальны сказ і адказаць на гэта пытанне, а таксама растлумачыць правапіс выдзеленых літар.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

– Якія сказы называюцца пытальнымі? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы пытальнага сказа?

– Выразна прачытайце сказы *(на дошцы)* і дайце свой адказ:

*Вы задаволены сваёй працай на ўроку? Што вам спадабалася на ўроку? Што для вас было цяжкім?*

***Свяцкая Галіна Аркадзьеўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Вілейская гімназія “Логас”»*

## Пабуджальныя сказы

***Мэта:*** фарміраванне ўмення адрозніваць пабуджальныя сказы ад апавядальных і пытальных.

***Задачы:***

- вучыць будаваць пабуджальныя сказы, правільна іх інтанаваць;
- практыкаваць у пастаноўцы знакаў прыпынку ў канцы сказа ў залежнасці ад мэты яго выказвання;
- выхоўваць навыкі бяспечных паводзін на дарозе.

***Абсталяванне:*** малюнак трохкаляровага святлафора, індывідуальныя двухбаковыя сігнальныя карткі (зялёны і чырвоны колеры), карткі з выявай святлафора і пустымі 3 акенцамі, каляровыя алоўкі.

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

– Адгадайце, хто сёння завітаў да нас у госці. *(Настаўнік чытае загадку В. Жуковіча пра святлафор.)*

Ці бачылі такое вы:
сваіх вачэй мяняю колеры
і размаўляю я вачыма,
са мной спрачацца немагчыма.
Вам памагаю з даўніх пор,
а назву маю... [13, с. 86].

– Сёння да нас завітаў Святлафор, які захацеў паўдзельнічаць і на ўроку беларускай мовы, а не толькі на ўроку «Асновы бяспекі жыццядзейнасці». *(На працягу ўрока настаўнік ацэньвае правільнасць адказаў вучняў пэўным колерам святлафора.)*

– Нагадайце, для чаго прызначаны святлафор? *(Святлафо́р – прылада сігналізацыі, прызначаная для рэгулявання руху людзей, аўтамабіляў.)* Дзе яшчэ можна сустрэць святлафоры? *(На чыгунцы, у метро, на стаянках аўтамабіляў, на берагах судаходных рэк і мораў.)* Што абазначае на вуліцы для нас кожны з трох колераў святлафора. *(Чырвоны – «Стой», жоўты – «Увага» і зялёны – «Ідзі».)*

– Мы на ўроку будзем карыстацца святлафорам – двухбаковай карткай з зялёным і чырвоным колерам. Зялёны колер сігнала для нас будзе абазначаць «ТАК», чырвоны – «НЕ». Давайце праверым з дапамогай сігналаў ваш настрой на працу. Будзем адпачываць? *(«НЕ»)* Згодны добра папрацаваць? *(«ТАК»)*

**II. Актуалізацыя ведаў.**

**2.1. Гульня «Так – не»** (з выкарыстаннем святлафораў).

– Сказы складаюцца з гукаў.

– Сказ выражае закончаную думку.

– У апавядальным сказе выражаецца пытанне.

– Па мэце выказвання сказы падзяляюцца на апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя.

– У канцы пытальнага сказа ставіцца пытальнік.

– У сказе можа выражацца паведамленне, пытанне, просьба, загад.

– Малайцы! Святлафор задаволены. Якія сказы па мэце выказвання мне спатрэбіліся для гульні? *(Апавядальныя.)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*Фф Фі Фа Фо Фы фл аф фе*

*флікер фара шафёр шаша*

– Якой тэмай можна аб'яднаць словы ў другім радку? *(Правілы паводзін на дарозе.)* Для чаго патрэбна выконваць правілы дарожнага руху? *(Каб зберагчы здароўе і жыццё людзей.)*

– Вусна складзіце пытальны сказ са словам *флікер*. Які знак прыпынку вы паставіце ў канцы сказа на пісьме?

– Складзіце апавядальны сказ са словам *шаша*. Які знак прыпынку вы паставіце ў канцы гэтага сказа?

– Прачытайце словы, складзіце з іх сказ і запішыце яго: *дарожнага, саблюдай, руху, правілы*

– Што выражаецца ў сказе, які вы запісалі? *(Загад або просьба.)* Які знак прыпынку вы паставілі ў канцы сказа? *(Клічнік, кропку.)*

– Святлафор наш разгубіўся. Ён запаліў нам жоўты сігнал.

– Чаму клічнік? *(Важна звярнуць увагу на загад, прымусіць выканаць правілы.)* А калі паставіць кропку? Што будзе выражаць сказ? *(Сказ будзе выражаць не загад, а просьбу ці параду.)* Ці можна з дапамогай двух гэтых сказаў пабудзіць чалавека да дзеяння? *(Так.)* Святлафор намі вельмі задаволены. Ён запаліў нам зялёнае святло.

– Якія сказы па мэце выказвання мы ведаем? *(Апавядальныя і пытальныя сказы). Настаўнік прымацоўвае назвы тыпаў сказаў насупраць зялёнага колеру святлафора, а насупраць чырвонага прымацавана адваротнай стараной картка «пабуджальныя сказы».*

– Але Святлафор не ведае тэму ўрока. Ён запаліў нам чырвоны сігнал. Дапамажыце яму. Знайдзіце, пра якія яшчэ сказы па мэце выказвання мы будзем гаварыць сёння на ўроку. *(Пабуджальныя сказы.)*

*Картка «пабуджальныя сказы» адкрываецца.*

– Якія задачы мы будзем вырашаць на ўроку? Аб чым нам трэба даведацца? *(Вучні прапаноўваюць задачы ўрока. Настаўнік прымацоўвае да дошкі карткі насупраць жоўтага колеру.)*

– Задачы ўрока: даведацца, чым адрозніваюцца пабуджальныя сказы ад пытальных і апавядальных, якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы пабуджальных сказаў, як трэба вымаўляць пабуджальныя сказы.

Калі мы здолеем выканаць пастаўленыя задачы, то Святлафор зноў запаліць для нас зялёнае святло. У гэтым нам зноў дапаможа падручнік.

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Работа з правілам (с. 56).**

– Прачытайце правіла. Якія сказы называюцца пабуджальнымі? Якія знакі прыпынку могуць стаяць у канцы пабуджальных сказаў?

**4.2. Выкананне практыкавання 87 (с. 56).**

– Паслухайце верш. Да чаго заклікае аўтар? Чаму трэба быць уважлівымі на шашы? Якія сказы ўжываюцца ў вершы? Якія знакі прыпынку стаяць у канцы сказаў? Чаму?

– Спішыце першы і другі сказы. Падкрэсліце словы, у якіх выражаецца парада. Звярніце ўвагу на загаловак верша. Чаму аўтар паставіў клічнік?

– Якім сказам з'яўляецца загаловак верша? Чаму вы так думаеце? Як вызначыць, кропку ці клічнік трэба ставіць у канцы сказа?

– Мы выканалі адну з пастаўленых задач, але Святлафор запаліў для нас чырвонае святло. Што значыць чырвоны колер на святлафоры? *(Стой!)* Зараз мы павінны прыпыніць нашу працу і адпачыць.

**Фізкультхвілінка.**

**4.3. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 56).**

– Святлафор запаліў для нас жоўтае святло. Што гэта значыць? *(Увага!)* Для таго, каб рухацца далей, мы павінны зазірнуць у рубрыку «Завяжы вузялок!».

**4.4. Выкананне практыкавання 87 (с. 56).**

– Як правільна інтанаваць пабуджальныя сказы? У якіх словах верша заключаецца пабуджэнне да дзеяння? Як вы будзеце іх чытаць? Падрыхтуйцеся да самастойнага чытання. *(Настаўнік выклікае чытаць верш 2-3 вучняў. Абмеркаванне вынікаў чытання верша.)*

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

**5.1. Выкананне практыкавання 88 (с. 57)** *(Работа ў парах.)*

– Прачытайце, якія пабуджальныя сказы ў вас атрымаліся? Што яны выражаюць? Якія знакі прыпынку вы паставіце ў канцы? Ці можна паставіць іншы знак? Дакажыце. Запішыце 2 сказы на выбар.

– Для каго гэта заданне было лёгкім, пакажыце зялёны колер. Каму было складана – чырвоны.

**5.2. Выкананне практыкавання 89 (с. 57).**

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 90 (с. 58), правіла с. 56.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Якія задачы мы вырашалі на ўроку? Ці здолелі з імі справіцца? *(Вучні паказваюць колер сігнала індывідуальнай карткай.)* Святлафор запаліў для вас зялёнае святла. Як вы лічыце, што гэта значыць?

**VIII. Рэфлексія «Святлафор».** *Вучні на асобных картках замалёўваюць акенца ў выяве Святлафора пэўным колерам:*

- зялёны: усё зразумела, задаволены сваёй працай;
- жоўты: трэба папрацаваць, амаль усё атрымалася;
- чырвоны: тэма складаная, патрэбна дапамога.

## Клічныя сказы

***Мэта:*** азнаямленне з асаблівасцямі клічных сказаў у вуснай і пісьмовай мовах.

***Задачы:***

- фарміраваць уменні вызначаць прыметы клічных сказаў, правільна будаваць і нтанаваць клічныя сказы; практыкаваць у афармленні клічных сказаў на пісьме;
- развіваць мысленне і вуснае звязнае маўленне вучняў;
- садзейнічаць зацікаўленасці да беларускіх народных традыцый і жаданню іх захоўваць.

***Абсталяванне:*** выявы вясёлага і сумнага смайліка (на дошку і для вучняў), карткі кластара «Сказы па мэце выказвання», фотаздымкі музейнага комплекса старажытных рамёстваў «Дудуткі» – «Ганчарнай майстэрні», карткі «Прадоўжы сказ» (на дошку).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

*На дошцы размешчаны выявы вясёлага і сумнага смайліка.*

– Пакажыце смайлік, настрой якога вы хочаце атрымаць на ўроку. Растлумачце, чаму.

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Складанне кластара.**

– Для таго каб добра сёння зразумець тэму ўрока, мы складзём кластар «Сказы па мэце выказвання». Назавіце сказы па мэце выказвання. *(Настаўнік выслухоўвае адказы вучняў і прымацоўвае карткі кластара на дошцы.)* Што выражаецца ў кожным сказе? Які знак прыпынку стаіць у канцы сказа?

***Кластар***

*«Сказы па мэце выказвання»*

| апавядальныя | пытальныя | пабуджальныя |
|---|---|---|
| ↓ | ↓ | ↓ |
| паведамляецца пра падзеі, з'явы | выражаецца пытанне | выражаецца просьба, заклік, загад |
| ↓ | ↓ | ↓ |
| кропка | пытальнік | кропка, клічнік |

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*Кк Ка Ко Кі кл км кт кр*

*кропка коска клічнік*

*Дудуткі – музей старажытных народных рамёстваў.*

– Якое слова лішняе ў другім радку? Чаму? Растлумачце пастаноўку кропкі, клічніка ў канцы сказаў.

– Прачытайце і запішыце сказ трэцяга радка. Пастаўце ў канцы сказа патрэбны знак. Які ён па мэце выказвання? Які знак вы паставілі ў канцы сказа? З якой інтанацыяй вы яго вымаўляеце? Растлумачце. Ці можна замяніць у канцы гэтага сказа кропку на пытальнік, клічнік?

– Паспрабуйце прачытаць яго з моцным пачуццём. Запішыце гэты сказ як пытальны. А зараз паспрабуйце прачытаць пытальны сказ з моцным пачуццём. Як на пісьме адзначыць, што сказ вымаўляецца з моцным пачуццём, гучна? Хто здагадаўся, як могуць называцца такія сказы? Што вы можаце ўжо расказаць пра клічныя сказы?

– Якія задачы мы будзем вырашаць на ўроку? *(Вучні прапаноўваюць задачы ўрока, настаўнік прымацоўвае да дошкі карткі з задачамі ўрока.)* Сёння мы з вамі будзем вучыцца:

- вылучаць клічныя сказы ў вуснай і пісьмовай мовах;
- знаходзіць адрозненні ў іх вымаўленні;
- афармляць клічныя сказы на пісьме.

**3.2. Работа з фотаздымкамі.** *На дошцы змешчаны фотаздымкі музейнага комплекса старажытных рамёстваў «Дудуткі» – «Ганчарная майстэрня».*

– Складзіце па фотаздымкам апавядальны сказ. *(У Дудутках ёсць ганчарная майстэрня.)* Як ён вымаўляецца? Спакойна або з моцным пачуццём? Які знак прыпынку вы паставіце ў канцы сказа на пісьме? Які гэта сказ па інтанацыі: клічны ці няклічны? Вымавіце гэты сказ з моцным пачуццём. Калі мы можам так вымавіць гэты сказ? Які знак паставім зараз у канцы сказа? Які гэта сказ па інтанацыі: клічны ці няклічны?

– Замяніце гэты сказ на пытальны. Вымавіце гэты сказ з моцным пачуццём. Як вы лічыце, якія знакі прыпынку будуць стаяць у канцы сказа? Пацвердзім свае адказы правілам.

**3.3. Работа з правілам (с. 63).**

**VI. Замацаванне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 97 (с. 63)** *(калектыўная работа).*

– Выразна чытаем сказы па чарзе і назіраем за інтанацыяй. Назавіце: а) апавядальныя, б) пытальныя, в) пабуджальныя сказы.

– Якія з іх з’яўляюцца клічнымі? Выпішыце пытальны клічны сказ. Якія знакі прыпынку стаяць у канцы сказа?

*Дадатковы матэрыял для настаўніка:*

«Дудуткі» – музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій. Ён знаходзіцца ў Пухавіцкім раёне, 40 км ад Мінска, размешчаны на беразе ракі Пціч, недалёка ад вёскі Дудзічы. З XI ст. вёска Дудзічы ўпамінаецца ў летапісах, пазней становіцца цэнтрам рамесніцтва, кірмашоў, гандлю. Каб захаваць, узнавіць традыцыі і забяспечыць імі азнаямленне ўсіх, хто цікавіцца старажытнымі рамёствамі Беларусі, было вырашана стварыць у 1993 годзе музейны комплекс. Музей «Дудуткі» складаецца з некалькі комплексаў – гэта рамесны двор, стайня, заасад, гараж з рэтра-аўтамабілямі, ветраны млын і царква Іаана Прарока. У Дудутках шырока святкуюцца народныя абрадавыя святы з выкананнем усіх нацыянальных традыцый.

**Фізкультхвілінка.**

**4.2. Выкананне практыкавання 96 (с. 61).** *(Работа ў групах, вусна.)*

**4.3. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 64).**

– Як правільна трэба інтанаваць клічныя сказы?

**4.4. Гульня «Люстэрка»** (практ. 98, с. 64).

Вучні чытаюць па адным сказе і імкнуцца паказаць пачуццё радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення, гледзячы ў люстэрка.

**V. Дамашняе заданне.** Практ. 99, с. 64.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Якія задачы мы вырашалі на ўроку? Які матэрыял быў для вас новым? Што было цікавым?

**VII. Рэфлексія «Прадоўжы сказ».**

На дошцы змешчаны незакончаныя сказы. Вучні выбіраюць фразу і завяршаюць яе самастойна.

*Сёння я даведаў(ла)ся ... Было цікава… Было складана… Я зразумеў(ла), што… У мяне атрымалася… Раскажу дома, што ...*

## Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа

***Мэта:*** фарміраванне паняцця пра дзейнік.

***Задачы:***

- удасканальванне ўмення вызначаць дзейнік па сэнсавым пытанні;
- практыкаваць ва ўменні вызначаць галоўныя члены сказа па сэнсавых пытаннях, графічна выдзяляць у сказе граматычную аснову;
- стварыць умовы для развіцця граматычнага лада маўлення;
- садзейнічаць выхаванню беражлівых адносін да прыроды.

***Абсталяванне:*** выява дрэва (на дошку), контуры лісцікаў (для вучняў).

*Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*Вв Ва Ві Вя вм вл ву ав яв зв*

*Вецер, хмары, дождж.*

*Прыйшла халодная ... .*

– Запішыце спалучэнні літар.

– На якую тэму словы? Запішыце іх.

– Вусна складзіце сказы. Пра што або пра каго гаворыцца ў сказе? Што гаворыцца? Запішыце сказ, дапоўніце яго патрэбным словам. Пра што гаворыцца ў сказе? На якое пытанне адказвае гэта слова? Падкрэсліце яго адной рыскай.

– Што гаворыцца ў сказе пра восень? На якое пытанне адказвае гэта слова? Падкрэсліце яго дзвюма рыскамі. Ці можна назваць гэтыя словы галоўнымі ў сказе?

– Хто здагадаўся, аб чым сёння мы даведаемся? *(Як называюцца галоўныя словы ў сказе; будзем вучыцца вылучаць галоўныя словы ў сказе і ставіць да іх пытанні; графічна выдзяляць галоўныя члены сказа.)*

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 105 (с. 68).**

– Прачытайце тэму ўрока. Як называюцца галоўныя члены сказа? Дапоўніце сказы дзейнікамі і падбярыце загаловак да тэксту.

– Які настрой выклікае ў вас гэтая пара года? Якія правілы паводзін на прыродзе вы ведаеце?

**4.2. Работа з правілам на с. 68.**

**4.3. Выкананне практыкавання 106 (с. 68)**

– Складзіце з асобных слоў прыказкі, вызначце ў сказах дзейнікі.

**4.4. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 69).**

**V. Замацаванне новага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 107 (с. 69).** *(Работа ў парах.)*

– Дапоўніце скорагаворкі патрэбнымі словамі. Растлумачце выдзеленыя арфаграмы. Знайдзіце і падкрэсліце дзейнікі.

– Праверым, хто ўмее хутка і без памылак вымаўляць скорагаворку.

**Фізкультхвілінка «Восень».**

*Па небе паплылі хмары. (Рухі рукамі ўверсе: павольна злева направа.)*

*Падзьмуў моцны вецер. (Рухі рукамі ўгары:актыўна злева направа.)*

*Забарабаніў дождждык. (Рухі правай рукой па далоні левай.)*

*Дзеці схаваліся пад парасон.(Прысядаюць, рукі ўгары «замок».)*

**5.2. Выкананне практыкавання 108 (с. 69).**

– Запішыце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца дзейнікамі, падкрэсліце дзейнікі. *(Узаемаправерка.)*

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 109, с. 70, правіла прачытаць.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Якую тэму мы вывучалі? Як называюцца галоўныя члены сказа? Якія словы называюцца дзейнікамі? На якое пытанне яны адказваюць?

**VIII. Рэфлексія «Дрэва поспехаў».** *На дошцы: выява дрэва і лісточкі рознага колеру: зялёнага, жоўтага, чырвонага.*

– Да дрэва прымацуйце зялёныя лісточкі тыя, каму на ўроку ўсё зразумела і заданні выкананы без памылак; жоўтыя – тэма ўрока зразумела, але былі дапушчаны 1-2 памылкі; чырвоныя – тэма яшчэ складаная, патрэбна дапамога.

## Дадзеныя члены сказа

***Мэта:*** фарміраванне ўмення пашыраць аснову сказа дадзенымі членамі.

***Задачы:***

- практыкаваць у вылучэнні па пытаннях сувязі слоў у сказе;
- адпрацоўваць уменне распазнаваць дадзеныя члены сказа, якія паясняюць дзейнік, выказнік, і пашыраць імі аснову сказа;
- садзейнічаць выхаванню правільна праводзіць вольны час адпачынку.

***Абсталяванне:*** выява сонейка і кошыка (для дошкі); карткі «Пераблытаныя ланцужкі» (для вучняў).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**1.1. Рэфлексія «Сонейка».** Прадоўжыце сказ: «Мой настрой падобны на …сонейка; …сонейка і хмарку; …хмарку».

**II. Праверка дамашняга задання** (пр.116, с. 73).

– Назавіце граматычную аснову сказаў.

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Гульня «Кошык фактаў»** (на дошцы).

Вучні расказваюць усё, што ведаюць пра галоўныя члены сказа. За кожны правільны адказ змяшчаюць у кошык контуры кветкі або іншыя прадметы (па меркаванні настаўніка).

**3.2. Чыстапісанне.**

*Сс Сі Ся Са Св Ск ес іс ус см сл*

*дружная вясёлы прыгожае*

*Сабралася сям'я.*

– Запішыце спалучэнні літар.

– Прачытайце словы. На якое пытанне адказваюць? Што абазначаюць?

– Прачытайце сказ. Спішыце. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Дапоўніце сказ словам з другога радка. Як называюцца такія словы?

Для чаго яны патрэбны ў сказе? Як вы лічыце, якая тэма ўрока? Якія задачы паставім перад сабой?

– Сёння мы будзем:

●пашыраць аснову сказа іншымі словамі;

●даведаемся, як называюцца такія словы;

●устанаўліваць сувязь слоў у сказе па пытаннях, з дапамогай схем.

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 117** (с. 74).

– Вызначце граматычную аснову ў сказах. Знайдзіце і запішыце сказы з даданымі членамі.

**4.2. Работа з правілам (с. 74).**

**4.3. Выкананне практыкавання 118 (с. 74)**

– Дапоўніце сказы па пытаннях даданымі членамі.

**4.4. Работа з правілам (с. 75).**

**V. Замацаванне новага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 119 (с. 75).** *(Работа ў парах.)*

– Пасля абмеркавання задання выпішыце на выбар адзін сказ.

**Фізкультхвілінка.**

**5.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 76).**

**5.3. Выкананне практыкавання 120 (с. 76).** *(Работа ў парах.)*

– Дапоўніце сказы даданымі членамі па пытаннях. Знайдзіце сказ, які адпавядае схеме.

– Што вы можаце сказаць пра сям'ю? Якую дапамогу аказваеце сваёй сям'і?

**5.4. Выкананне практыкавання 121 (с. 77).** *(Узаемаправерка.)*

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 122, с. 77, правілы перачытаць.

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Якія задачы ўрока мы ставілі? Як мы з імі справіліся?

**VIII. Рэфлексія «Пераблытаныя ланцужкі».**

– Пастаўце сказы ў патрэбным парадку.

●Акрамя галоўных членаў, у сказе могуць быць даданыя. (4)

●Слова, якое абазначае, што гаворыцца ў сказе пра дзейнік, называецца выказнікам. (2)

●Слова, якое абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, – гэта дзейнік. (1)

●Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа. (3)

●Даданыя члены сказа паясняюць дзейнік, выказнік або іншыя даданыя члены сказа. (5)

***Невяроўская Ірына Віктараўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Гімназія № 1 імя У. А. Караля г. Чэрвеня»*

## Значэнне слова

***Мэта:*** пашырэнне ўяўлення вучняў аб лексічным значэнні слова.
***Задачы:***
- выпрацоўваць уменні ўстанаўліваць лексічнае значэнне слова з апорай на кантэкст ці з дапамогай тлумачальнага слоўніка, тлумачыць незразумелыя словы праз знаёмыя паняцці, фарміраваць навык практычнай дзейнасці з тлумачальным слоўнікам;
- узбагачаць слоўнікавы запас вучняў;
- выхоўваць паважлівыя адносіны да роднай мовы, культуры.

***Абсталяванне:*** крыжаванка «Слова» і тлумачальныя слоўнікі.

### *Ход урока*

**І. Арганізацыйны момант.**

Настаўнік чытае верш Р. Эрыставі «Запрашэнне ў школу» (пераклад К. Цвіркі) [34, с. 153]. На дошцы запіс верша з памылкамі:

Пара ўставаць,
хто спіць яшчэ!
Гэй, мігам апранацца?
Усім збірацца найхутчэй
ды за навуку брацца.

**ІІ. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Работа з вершам** *(на дошцы).*

– Прачытайце верш. Знайдзіце памылкі. Якія знакі прыпынку трэба паставіць? Колькі сказаў у вершы? Якія гэта сказы? Паспрабуем прачытаць верш разам уголас адпаведна са знакамі прыпынку.

**2.2. Адгадванне крыжаванкі (на дошцы).**

– Сёння нас запрашае ў госці навука «лексікалогія», якая вывучае... А што яна вывучае, мы даведаемся, калі разгадаем крыжаванку.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. м | е | с | я | ц | | | | | |
| | 2. б | л | і | ш | ч | ы | ц | ь | |
| | 3. в | о | с | е | н | ь | с | к | і |
| 4. а | к | в | а | р | ы | у | м | | |
| | 5. т | а | л | е | р | к | а | | |

1. Планета, самая блізкая да Зямлі. *(Месяц.)*
2. Золата і ў смецці ...*(блішчыць).*
3. Тое, што і асенні. *(Восеньскі.)*
4. Штучны вадаём або шкляны посуд для ўтрымання і гадоўлі рыб. *(Акварыум.)*
5. Сталовы посуд круглай формы з шырокім дном. *(Талерка.)*

– Што агульнага ва ўсіх гэтых словах? *(Гэта слоўнікавыя словы.)* Што абазначаюць гэтыя словы? На якія пытанні адказваюць?

– Лексікалогія вывучае слоўнікавы склад мовы. Працей кажучы, вывучае словы, з якіх складаецца мова. Слова – асноўная адзінка мовы.

**2.3. Чыстапісанне.**

*бл// сл// мл// ум //ры*

*блішчаць месяц мяккі акварыум*

– Якое спалучэнне літар лішняе? Чаму? *(ры – верхняе злучэнне).*

– Звярніце ўвагу на каліграфічнае напісанне малых літар *м, л.* Старайцеся правільна прапісаць кожны элемент, захаваць нахіл, вышыню літар. Пры злучэнні літар звярніце ўвагу на від злучэння. Падкрэсліце тыя злучэнні, якія, на ваш погляд, запісаны правільна.

– Знайдзіце арфаграмы ў словах другога радка і запішыце слоўнікавыя словы. Пастаўце націск, падкрэсліце арфаграмы.

– Выкарыстоўваючы два словы з другога радка, складзіце сказ і запішыце яго ў трэцім радку. Які сказ па мэце выказвання вы запісалі?

– Абмяняйцеся сшыткамі, праверце акуратнасць і правільнасць напісання літар, слоў. Ацаніце работу сябра на лінейцы поспеху.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Гульня «Пазнай слова».**

– На ўроку мы бліжэй пазнаёмімся са словамі, навучымся разумець іх, папоўнім слоўнікавы запас новымі словамі. Навучымся вызначаць лексічнае значэнне слова. Што такое лексічнае значэнне слова? Адказаць на гэта пытанне вы зможаце пасля гульні.

– Здагадайцеся па лексічным значэнні, якое слова я загадала.

Невялікі жвавы звярок з доўгім пушыстым хвастом. *(Вавёрка.)*

Самая цёплая пара года. *(Лета.)*

Прылада для пісьма. Мае чорны графічны стрыжань, які сціраецца гумкай. *(Аловак.)*

Рухацца ў паветры пры дапамозе крылаў. *(Ляцець.)*

**3.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 86).**

– Што такое лексічнае значэнне слова? *(Лексічнае значэнне слова – гэта яго сэнс, тое, што слова абазначае). Знаёмства са структурай тлумачальнага слоўніка, яго прызначэннем.*

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практ. 133 (с. 86).** *(Работа ў парах па варыянтах.)*

– Растлумачце словы: варыянт 1 – *асілак,* варыянт 2 – *здарожыцца,* варыянт 3 – *гасцінны.*

– Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце свой сказ.

**Фізкультхвілінка.**

Як толькі сонейка прачнецца, *(устаць з-за парты)*
за справы хуценька бярэцца: *(кругі рукамі)*
разбудзіць сонных дзетак, *(кулачкамі пацерці вочкі)*

сагрэе лес, палетак, *(абняць сябе за плечы)*
дасць моцы ўсім хто хворы *(зрабіць рыўкі рукамі)*
і падтрымае ў горы. *(паціснуць адзін аднаму рукі)*
Мы вельмі просім: «Сонца, *(папляскаць у далоні)*
Зірні ў школьнае аконца».

**4.2. Выкананне практыкавання 134 (с. 86).**

– Прачытайце верш «Якія бываюць словы?» і адкажыце на пытанне верша, знайдзіце словы па іх значэнні. Запішыце на выбар два словы з іх значэннем. *(Калектыўная праверка.)*

**4.3. Выкананне практыкавання 135 (с. 87).**

– Раслумачце прыказку. Прачытайце яе некалькі разоў і запішыце прыказку па памяці.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

**5.1. Выкананне тэста.** Запішыце літару правільнага адказа.

1. Што такое лексічнае значэнне слова?

*а) Тое, як вымаўляецца слова.*

*б) Тое, што слова абазначае, называючы што-небудзь.*

*в) Тое, як слова пішацца.*

2. У якім слоўніку раскрываецца лексічнае значэнне слова?

*а) руска-беларускі слоўнік;*

*б) арфаграфічны слоўнік;*

*в) тлумачальны слоўнік.*

3. Запішыце лішняе слова ў кожным радку:

*а) чацвер, сакавік, студзень, лістапад;*

*б) морква, агурок, дождж, цыбуля;*

*в) парта, шафа, кватэра, стол.*

– Дзе мы можам прымяніць веды па тэме «Лексічнае значэнне слова»? Пры складанні крыжаванак, разгадванні загадак, гульні ў словы, напісанні тэкстаў і інш. *(Ацэнка работы вучняў настаўнікам.)*

**VI. Дамашняе заданне.** Практ 136, с. 88, правіла с. 86.

**VII. Рэфлексія.** Аб чым вы даведаліся на ўроку? Што было самым цікавым? Якія заданні былі складанымі?

## Адназначныя і мнагазначныя словы

***Мэта:*** азнаямленне з мнагазначнымі і адназначнымі словамі.

***Задачы:***

- пашырыць уяўленне пра мнагазначныя і адназначныя словы;
- развіваць уменне вызначаць лексічнае значэнне мнагазначных і адназначных слоў, замацоўваць уменне карыстацца тлумачальнымі слоўнікамі;
- выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** карткі «Значэнне слова» (для вучняў), карткі для 3-й групы (словы і малюнкі).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

На дошку з практ. 136 вучні запісваюць словы, якія аказаліся лішнімі: *кот, пчала, мёд, дарога, дрэва.*

– Чаму гэтыя словы лішнія? Якое значэнне яны маюць? Што аб’ядноўвае словы ў радках? Падбярыце да слоў, напісаных на дошцы, словы з падобным значэннем (хатнія жывёлы, насякомыя, месца для руху, расліны).

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Паўтарэнне вывучанага правіла.**

На дошцы запісаны словы: *лексічнае, слова, значэнне, кожнае, мае.*

*Кожнае слова мае лексічнае значэнне.*

– Складзіце сказ. Дзе мы з ім сустрэліся? *(У рубрыцы «Завяжы вузялок»).* Якую тэму мы вывучалі на апошнім уроку? *(Значэнне слова.)*

**3.2. Чыстапісанне.**

*од//до//ад//...//ав//...//...//во//...//...*

– Якія спалучэнні літар прапушчаны? Паглядзіце, калі ласка, на напісанне гэтых літар. Што можна аб іх сказаць? Якія гукі яны абазначаюць? *(Зычныя, галосныя, звонкія, парныя, націскныя, ненаціскныя).* Якімі злучэннямі яны злучаны паміж сабой? Што агульнага мы бачым пры іх напісанні? *(Ва ўсіх літарах ёсць авал.)* Якая літара складаецца толькі з авала? *(О)* Назавіце словы з літарай О.

– Гэтыя літары звязаны са словамі на дошцы. Хто згодны са мной?

– Прапішыце чыстапісанне, захоўваючы правільны нахіл, вышыню літар, правільна пішыце авал.

*Палё.., гора.., ліс.., сусе..ка, шкарпэ..кі.*

– Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары. Якімі літарамі абазначаецца гук *т?* Запішыце тыя словы, значэнне якіх вы ведаеце.

– Значэнне якіх слоў для вас незразумела? Знайдзіце значэнне ў слоўніку. Складзіце з гэтым словам сказ. *(Шкарпэткі – гэта кароткія панчохі (рус. яз. – носки). Панчохі – гэта вязаны выраб, які нацягваецца на ногі і заходзіць за калені.)*

– У трэцім радку запішыце сказ: *Бабуля звязала Машы прыгожыя шкарпэткі.*

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Вызначэнне лексічнага значэння слоў** *(работа ў парах).*

– Прачытайце. Злучыце стрэлкамі словы з іх значэннем.

<table>
<tr><td>Струнны шчыпковы музычны інструмент славянскіх народаў</td><td rowspan="4">гуслі<br><br>сшытак<br><br>конь<br><br>лес<br><br>морква<br><br>сябар</td><td>Брус на чатырох ножках для гімнастыкі</td></tr>
<tr><td>Шахматная фігура з галавой каня</td><td>Агародная расліна аранжавага колеру з саладкаватым смакам</td></tr>
<tr><td>Жывёла, якая выкарыстоўваецца для перавозу людзей і грузаў</td><td>Дрэвы, які займаюць вялікую прастору</td></tr>
<tr><td>Чалавек, з якім вас звязваюць агульныя інтарэсы і прыхільнасць</td><td>Сшытыя лісты чыстай паперы ў вокладцы</td></tr>
</table>

**4.2. Вызначэнне адназначных і мнагазначных слоў.**

– Якое з запісаных слоў мае некалькі значэнняў? Як можна назваць такія словы? *(Мнагазначныя.)*

– Як вы думаеце, якая тэма нашага ўрока і што мы будзем вывучаць? *(Мнагазначныя і адназначныя словы. Мы навучымся адрозніваць іх, зразумеем, як утвараюцца мнагазначныя словы, працягнем работу з тлумачальным слоўнікам.)*

– Адназначныя словы маюць толькі прамое значэнне: дудар, абрус, сасна, канюшына, трохвугольнік, алень, гуслі, кісларод і г. д. Словы, якія ўзніклі даўно, маюць многа значэнняў. Напрыклад, слова *ісці* – 28 значэнняў, слова *біць* – 18 значэнняў. Перанос назвы аднаго прадмета на другі адбываецца на аснове падабенства іх прымет, формы, колеру, прызначэння, асацыяцый.

**4.3. Разыгрыванне дыялога «Размова».** Два вучні разыгрываюць, астатнія адгадваюць, дзе мог адбыцца дыялог.

*– Дайце мне, калі ласка, дзве ручкі.*

*– Драўляныя ці металічныя? Для ўваходных дзвярэй ці для шафы?*

*– Любыя, толькі каб з сінім стрыжнем.*

– Чаму прадавец не адразу зразумеў пакупніка? Якое слова з дыялога з'яўляецца мнагазначным?

**4.4. Выкананне практыкавання 137 (с. 88).**

– Разгледзьце схемы і скажыце, колькі значэнняў маюць запісаныя словы. Растлумачце значэнне гэтых слоў і праверце свой адказ па тлумачальным слоўніку.

– Якое значэнне мае слова *дровы*? Колькі значэнняў у слова *ножка* ? Якое значэнне не адлюстравана на малюнку?

*Ножка* – 1. Маленькая нага. 2. Апора, стойка мэблі. 3. Ніжняя частка грыба. 4. Частка некаторых інструментаў (ножка цыркуля).

**4.5. Работа з правілам (с. 88).**

**V. Замацаванне новага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 138 (с. 89)** *(работа ў парах).*

– Кожная пара атрымлівае два словы і знаходзіць іх значэнне ў тлумачальным слоўніку. Спісвае тлумачэнне, падкрэслівае адназначныя словы. Запісвае сказ з адназначнымі словамі. *(Узаемаправерка.)*

*Для звестак:*

*Ручнік* – вузкі прадаўгаваты кавалак тканіны, спецыяльна прызначаны для выцірання твару, рук, цела ці пасуды.

*Сервіз* – поўны набор сталовай або чайнай пасуды, разлічаны на пэўную колькасць чалавек.

*Ваза* – пасудзіна для кветак, садавіны.

*Ружа* – дэкаратыўная расліна са сцяблом, пакрытым калючкамі.

*Маска* – 1) накладка на твар, падобная на звярыную морду або чалавечы твар; тэатральная маска; маска зайца; 2) засцерагальнае прыстасаванне, якое надзяваюць на твар; маска для падводнага плавання; 3) у касметыцы – слой накладзенага на твар лекавага саставу, крэму.

*Клетка* – 1) памяшканне для птушак і жывёл; 2) спосаб складання дроў, дошак, цэглы ў выглядзе чатырохвугольніка; 3) чатырохвугольнік, начэрчаны на паверхні чаго-небудзь; клетка шахматнай дошкі; тканіна ў клетку; 4) элементарная адзінка будовы жывога арганізма (раслінная клетка).

**5.2. Выкананне практыкаванняў 139, 140 (с. 87)** *(работа ў групах).*

Група 1 (практ. 139). Вызначаюць групу мнагазначных і адназначных слоў. Знаходзяць значэнне слоў: дзяўчынка, дошка, хлопчык, нос. Размяркоўваюць іх у групы. *(Адназначныя: дзяўчынка, хлопчык. Мнагазначныя: дошка, нос.)*

*Для звестак:*

*Дошка* – 1) плоскі, шырокі кавалак дрэва, выпілаваны з бервяна; 2) школьная прылада, на якой пішуць крэйдай; 3) прыстасаванне для чаго-небудзь у выглядзе пліты, пласціны (шахматная дошка).

*Хлопчык* – дзіця або падлетак мужчынскага полу.

*Нос* – 1) выступ паміж вачамі і ротам на твары чалавека або мордзе жывёлы, які з'яўляецца пачаткам дыхальных шляхоў і органам нюху; 2) дзюба ў птушкі (Прыклад: Хто б дзятла ведаў, каб не яго доўгі нос!); 3) пярэдняя частка судна, лодкі, самалёта; 4) тое, што і насок (боты з тупымі насамі).

Група 2 (практ. 140). Знайсці словы па іх значэнні. Назваць мнагазначныя словы. Выпісаць адназначныя словы разам з іх значэннем.

Група 3. Суаднесці малюнкі і словы. Размеркаваць словы ў два слупкі. Запісаць адназначныя словы. *(Адназначныя: лімон, снег, акварыум, медаль, дзверы, стадыён, дождж. Мнагазначныя: труба, ручка, крыло, бялок, хвост, кран, званочак, іголка.)*

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Назавіце прымету, па якой можна аб'яднаць словы ў кожным радку:

*Музыкант, самалёт, падручнік, скрыпка, ..., ... .*

*Марка, карта, ножка, машына, ..., ... .*

– Вусна дапоўніце кожны рад слоў, выкарыстоўваючы словы: *спектакль, ручка, футбол, маланка.*

**VII. Дамашняе заданне.** Практ. 141, с. 90, правіла на с. 88.

**VIII. Рэфлексія.**

– «Не проста ў словы я гуляю, на мове роднай размаўляю», – пісаў у вершы «На мове роднай» Мікола Мятліцкі [15, с. 213]. Што неабходна нам рабіць, каб беларуская мова гучала часцей? Што залежыць ад нас з вамі? Які вывад для сябе мы сёння зробім?

## Прамое і пераноснае значэнне слова

***Мэта:*** увядзенне паняццяў «прамое» і «пераноснае» значэнні мнагазначных слоў.

***Задачы:***

- выпрацоўваць уменне вызначаць прамое і пераноснае лексічнае значэнне слоў;
- узбагачаць маўленне вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы;
- выклікаць жаданне вывучаць беларускую мову.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнем (для вучняў).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

– Намалюйце кветку свайго настрою, пакладзіце перад сабою на парце. Чаму кветкі ва ўсіх розныя? Бо мы ўсе розныя, але вучымся разам у адным класе, дапамагаем адзін аднаму. У канцы ўрока ўпрыгожым кветкамі дошку.

**II. Праверка дамашняга задання.** Практ. 143 с. 90.

– Якое мнагазначнае слова вы падкрэслілі? Якое значэнне яно мае?

*Іголка – прыстасаванне для шыцця; тонкі металічны стрыжань з завостраным канцом (іголка ў медыцынскім шпрыцы, магнітафонная іголка і г. д.); ліст хвойных дрэў і кустоў; тонкая калючка на целе некаторых жывёл; тонкі востры крышталь (іголка інею).*

– У якім значэнні ўжыта гэта слова?

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

– У якім слоўніку можна даведацца пра лексічнае значэнне слова? Якія словы называюцца адназначнымі? Якія мнагазначнымі?

**3.1. Чыстапісанне.**

*жм жо жр жа*

*мара мядзведзь мора*

– Уважліва паглядзіце на першы радок і вызначце галоўнае слова ў чыстапісанні. *(Мора.)* Складзіце сказ са словам *мора*. Запішыце.

*Летам мы адпачывалі на моры.*

**IV. Вывучэнне новага матэрылу.**

**4.1. Выяўленне значэнняў мнагазначных слоў у кантэксце.**

– Калі мы гаворым слова *мора,* які вобраз у нас узнікае? Вобраз вялікай воднай прасторы з салёнай вадой, шмат вады. Гэта **прамое** значэнне слова. А калі мы скажам *мора фарбаў, мора людзей.* Што мы ўяўляем*?* Мы бачым вялікую колькасць фарбаў, кветак, людзей. Гэта **пераноснае** значэнне слова *мора*, якое абазначае вялікую колькасць чаго-небудзь або каго-небудзь.

– Запішыце сказ пад дыктоўку: «*У нашым класе мора кветак».* У якім значэнні ўжываецца ў гэтым сказе слова *мора*?

– Якое значэнне ёсць у кожнага слова? *(Прамое)* А пераноснае – у кожнага слова? Як вы лічыце, аб чым будзе ісці размова на ўроку. Высветлім тэму нашага ўрока *(апорныя словы запісаны на дошцы).*

*На ўроку мы даведаемся…* (якія словы маюць прамое і пераноснае значэнне).

*Мы навучымся…* (адрозніваць іх у сказах).

*Зразумеем…* (навошта словы выкарыстоўваюцца ў пераносным значэнні).

*Пазнаёмімся…* (з правілам знаходжання слоў з пераносным значэннем у слоўніку).

**4.2. Вылучэнне слоў у сказах, якія ўжываюцца ў прамым значэнні.** *(Сказы запісаны на дошцы.)*

– Якое слова ў кожнай пары сказаў ужываецца ў прамым значэнні?

*Дзеці купаюцца ў рэчцы. Месяц купаецца ў хмарах.*

*Усю зіму спіць у берлагу мядзведзь. Пад снежнай коўдрай спяць палеткі.*

Словы «купаецца», «спіць» – перанесена на аснове падабенства дзеянняў.

**4.3. Выкананне практыкавання 142 (с. 91).** *(Работа ў парах.)*

– Спішыце сказы, у якіх прыродныя з’явы апісваюцца вобразна. Якія словы дапамаглі стварыць вобразнае апісанне?

**4.4. Работа над правілам на с. 91.**

– Растлумачце, як вы разумееце паняцце «пераноснае значэнне».

– Вызначыць, у якім значэнні ўжываецца слова, можна толькі ў сказе або ў тлумачальным слоўніку. Першым у слоўніку заўсёды даецца прамое значэнне, а потым – пераноснае.

**4.5. Выкананне практыкавання 143 (с. 92).**

– Прачытайце тэкст «Вобразная мова». Якую мову можна назваць вобразнай? У якім значэнні ўжыты выдзеленыя словы. Для чаго выкарыстоўваць у мове словы з пераносным значэннем?

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне задання на картках.** *(Работа ў парах.)*

1) Знайдзіце словазлучэнні з аднолькавымі словамі і запішыце іх парамі:

*Цвёрдае слова, сухое сена, глыбокая думка, сухі адказ, глыбокае возера, глухі куток, цвёрды камень, гняздо ластаўкі, глухі чалавек, бацькоўскае гняздо.*

2) Запішыце словазлучэнні ў два слупкі: I – прамое значэнне, II – пераноснае значэнне.

*Зялёная трава, пчаліны мёд, цяжкі характар, смачны хлеб, залатыя рукі, халоднае сэрца, снежная лавіна, калючы позірк, высокі чалавек, прыгожая дзяўчынка, глухія сцежкі, новы аўтамабіль.*

**5.2. Выкананне практыкавання 145 (с. 93).** *(Работа ў парах.)*

– Складзіце сказы, у якіх выдзеленыя словы будуць ужывацца ў прамым значэнні.

**5.3. Вызначэнне вобразна-выяўленчых сродкаў у вершах.** *(Работа ў групах.)*

– Прачытайце вершы, падкрэсліце вобразныя словы, словы, якія ўжыты ў пераносным значэнні.

1) Верш з практ. 147.

2) Верш з практ. 9.

3) Верш з практ. 37.

4) Верш з практ. 43.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Як вы думаеце, аб чым наступная загадка?

*Не мёд, а да ўсяго ліпнуць. (Словы.)*

– Чаму менавіта гэту загадку я вам загадала? Чаму словы «ліпнуць да ўсяго»? У якім значэнні ўжыта слова «ліпнуць»?

– На ўроку мы даведаліся, што ў мнагазначных слоў ёсць … . Якое значэнне слова называецца прамым?

– Словы ў пераносным значэнні робяць нашу мову … . Як узнікае пераноснае значэнне слова? Словы ў пераносным значэнні любяць выкарыстоўваць у сваёй творчасці … .

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 148, с. 94, правіла на с. 91.

**IX. Рэфлексія «Паляна кветак».**

– Хто застаўся з добрым настроем, як і на пачатку ўрока, прымацуйце свае кветкі на дошку. У падзяку за вашу працу на ўроку я дадаю сваю кветачку.

***Сакалова Валянціна Іванаўна,***
*метадыст вучэбна-метадычнага аддзела*
*дашкольнай і пачатковай адукацыі*
*Мінскага абласнога інстытут развіцця адукацыі*

# Прыстаўка

***Мэта:*** азнаямленне з прыстаўкай як значымай часткай слова.
***Задачы:***
- даць уяўленне пра прыстаўку як значымую частку слова, яе ролю ў слове; замацоўваць уменні вызначаць корань у словах; практыкаваць у знаходжанні прыстаўкі ў словах і графічна абазначаць іх;
- выпрацоўваць навык дзеяння па шматкрокавай інструкцыі; развіваць вокамер; развіваць вуснае маўленне;
- зацікавіць народнай беларускай культурнай спадчынай у сімвалах і прыметах, абрадах.

***Абсталяванне:*** папяровая стылізаваная выява птушкі і знака прыстаўкі, (на дошку), нажніцы і палова аркуша паперы ў клетку (для вучняў); мультымедыйная прэзентацыя або малюнкі 3-4 выяў стылізаваных птушак народных майстроў, прыметы на картках (для вучняў); аўдыёзапіс абрадавай песні «Жавароначкі, прыляціце!».

***Ход урока***

**І. Арганізацыйны момант.**

– Паглядзіце, якая птушка сёння заляцела да нас на ўрок, ёй хочацца даведацца, што мы будзем вывучаць. *(Птушка прымацоўваецца на дошку).* Птушкі ўшаноўваюцца рознымі народамі як сімвал сям'і таму, што большасць з іх уюць гнёзды і, адлятаючы кожны год у вырай, зноў вяртаюцца на радзіму. Ці можна сказаць дакладна, на якую пэўную птушку яна падобна? Такіх стылізаваных птушак нашы продкі вышывалі на тканінах, майстравалі з саломы, выразалі з дрэва. Так беларусы і другія славянскія народы заклікалі багацце і любоў або аберагалі сябе ад злой сілы і ўпрыгожвалі свае рэчы.

*Дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя або малюнкі 3-4 выяў стылізаваных птушак народных майстроў.*

**ІІ. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Вырэзванне птушкі.**

– Ці падабаецца вам птушка? Каб ёй было адной не сумна, зробім ёй сяброўак. Нам спатрэбяцца нажніцы і аркуш паперы ў клетку. Яны дапамогуць у разуменні мэты нашага ўрока. Нагадайце з урока працоўнага навучання правілы бяспекі пры карыстанні нажніцамі.

*Настаўнік дэманструе дзеянні і прагаворвае іх перад вучнямі.*

– Калі ласка, вазьміце нажніцы і аркуш паперы. Слухайце ўважліва і выконвайце каманды, якія вам трэба зрабіць:

1) *абрэзаць* палоску па лініі палёў;

2) *адрэзаць* правы верхні вугал (каля 5 клетак знізу ад вяршыні і зверху ўлева);

3) *зрэзаць* левы верхні вугал (каля 7 клетак);

4) *надрэзаць* прама ў левы бок аркуш ад правага верхняга вугла знізу (каля 4 клетак);

5) *падрэзаць* аркуш ад сярэдзіны ніжняй даўжыні да надрэзу ўправа;

6) *прарэзаць* аркуш ад сярэдзіны ніжняй даўжыні да правага верхняга вугла знізу;

7) *выразаць* трохвугольнік зверху паміж верхнімі правымі і левымі вугламі.



– Што рабілі нажніцамі? *(Рэзалі паперу.)* Узгадайце, якія дзеянні мы яшчэ рабілі нажніцамі? *(На дошцы настаўнік запісвае слова* ***рэзаць*** *і ў слупок пад ім дапісвае адказы вучняў: абрэзаць, адрэзаць, зрэзаць, надрэзаць, прарэзаць, выразаць.*). А каб атрымаць палову аркуша, што трэба зрабіць з цэлым? *(Разрэзаць.)*

– Што вы заўважылі ў словах аднолькавага? *(Аднолькавая частка* ***рэзаць.)*** Ці можна назваць гэтыя словы аднакаранёвымі? Выдзеліце корань. Чым адрозніваюцца словы ў слупку? *(Першай часткай.)*

**2.2. Чыстапісанне.**

– Як вы думаеце, што будзем высвятляць на ўроку? *(Як называюцца гэтыя часткі слова і навошта яны патрэбны.)* Падкажыце, дзе будзем шукаць іх у слове? *(У пачатку слова, перад коранем.)*

Прапішам гэтыя часткі. Звяртаем увагу на злучэнне паміж літарамі, прытрымліваемся аднолькавай даўжыні прамой доўгай лініі *р* і пецель літар *д, з*; сочым за вышынёю пятлі літары *в* і злучэннем яе з літарай *ы*.

*аб ад над пад*

*перад пра прад*

*з раз вы*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Работа з правілам.**

– Адгарніце падручнік на с. 4 (ч. 2) і даведаецеся, як называецца частка слова перад коранем. На якія нашы пытанні да ўрока нам дапамагло адказаць правіла?

– Навошта патрэбна прыстаўка ў слове? Ці былі нашы дзеянні па вырэзванні птушкі аднолькавыя? *(Падобныя, але не аднолькавыя.*

*Гэта новыя, іншыя словы, але з аднолькавым коранем, роднасныя, аднакаранёвыя.)* Гэтыя часткі дапамаглі назваць па сутнасці адно дзеянне з нажніцамі living словамі, удакладніць сэнс кожнага дзеяння.

**3.2. Выкананне практыкавання 1 (с. 3).**

– Прачытайце першае заданне практыкавання і адкажыце на пытанні да яго. *(Настаўнік прымацоўвае да дзюбы птушкі папяровы знак прыстаўкі.)*

– Паглядзіце, якую галінку ў дзюбе прынесла птушачка? Яна прынесла нам падарунак у падзяку за нашу гасціннасць і дружалюбнасць.

– Ці простая галінка ў яе дзюбе? Прачытайце заданне пад практыкаваннем. Хто здагадаўся, што гэта. *(Знак прыстаўкі.)* Вось так мы будзем абазначаць прыстаўкі. *(На дошцы ў слупочку слоў настаўнік вызначае прыстаўкі.)*

– Запішыце аднакаранёвыя словы і вызначце прыстаўкі.

**Фізкультхвілінка.**

**IV. Замацаванне вывучанага.**

**4.1. Выкананне практыкавання 2 (с. 2).**

– Якая птушка кожную раніцу першая голасна сустракае сонейка? *(Певень).* Ці падобна наша птушка на пеўня? *(Не хапае грабяня і бародкі, шпораў.)* Як пеўнік лёгка ўскоквае на плот, так і мы паспрабуем пераскокваць з прыступкі на прыступку «лесвіцы» з прыставак. *(I варыянт – першы слупок, II варыянт – другі слупок).* Запішыце ўтвораныя словы і выдзеліце ў іх прыстаўку знакам.

**4.2. Выкананне практыкавання 2 (с. 3).**

– За сваю яркую афарбоўку і сустрэчу першым сонейка певень у беларускай культуры лічыцца сімвалам сонца, пачатку дня (жыцця), росквіту і багацця.

**4.3. Выкананне практыкавання 3 (с. 4).** (*Работа ў парах.)*

– Павітаемся і мы з сонейкам праз верш «Прачынанка». Запішыце выдзеленыя словы. Вусна падбярыце да іх аднакаранёвыя словы і выдзеліце прыстаўкі.

**4.4. Падбор прыстаўкі да слова па сэнсе сказа.** *(Работа ў групах.)*

– Хто ведае, якая птушка з'яўляецца сімвалам надыходу вясны? *(Жаваранак.)* Як называецца такое свята? *(Сустрэча вясны.)* Як абрад адбываецца? *(Гаспадыні пякуць печыва «жаваранак». Дзеці выходзяць на высокае месца і падкідваюць печыва ўгору, спяваюць заклічкі вясне.)*

– Паглядзіце на дошку і падбярыце па сэнсе да заклічкі дзве пары розных прыставак:

Жавароначкі, ___ляціце!

Зямлю-матухну ___будзіце! [14, с. 20]

*(Пры-ляціце, па-ляціце; раз-будзіце, пра-будзіце, а-будзіце.)*

– Запішыце заклічку ў сшытак і вызначце прыстаўку ў падабраных словах.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

**5.1. Гульня «Хто больш».**

– Існуюць да гэтага часу і народныя прыметы пра надвор’е па назіраннях за дамашнімі і дзікімі птушкамі. Ці ведаеце вы такія прыметы? Пазнаёмцеся з некаторымі прыметамі на картках. Выпішыце ўсе словы з прыстаўкамі:

*Жаўрукі завісаюць у небе і звонка спяваюць – да добрага надвор’я без ападкаў. Птушкі садзяцца на верхавіны дрэў – да цяпла. Калі ў сярэдзіне ліпеня зязюля працягвае кукаваць, лета будзе добрае і доўгае. Галубы разбуркаваліся – да цяпла. Ластаўкі нізка пралятаюць над вадой – да дажджу і ветру. Гусакі паднімаюць пад сябе адну нагу – да марозу. Чайкі садзяцца на ваду – дождж хутка спыніцца, наступіць добрае надвор’е.*

Увага настаўніку! Пажадана выпісваць словы на невялікім аркушы. Магчыма выстаўленне лепшых адзнак вучням па колькасці знойдзеных слоў у заданні, але неабходна аб гэтым папярэдзіць перад азнаямленнем з заданнем.

Адказ: *за- вісаюць, с- пяваюць, над- вор’я, а- падкаў, пра- цягвае, раз- буркаваліся, пра- лятаюць, пад- німаюць, с- пыніцца, на- двор’е. Слова* ***надвор’е*** *паўтараецца, лічыць адзін раз.*

– У Беларусі існуе яшчэ шмат розных свят і абрадаў, павер’яў, легенд, прамавак і прыказак, у якіх упамінаюцца буслы, журавы, лебедзі, галубы, кнігаўкі, крумкачы, каршукі, вераб’і, вароны, сарокі, совы і інш. Знаходзьце, калі ласка, цікавыя звесткі пра значэнне птушак у беларускай народнай культуры. Магчыма, нам захочацца стварыць цікавы праект.

**VI. Рэфлексія.**

– Прымацуйце сваю птушку на адну з трох галінак кусціка (або дрэва), які зараз абазначаны (намаляваны) на дошцы:

верхняя – усё было зразумела, магу дапамагчы аднакласнікам;

сярэдняя – зразумела, выканаю сам, але не ўсё растлумачу другому;

ніжняя – зразумела, але выконваць з дапамогай будзе лягчэй.

*Гучыць аўдыёзапіс абрадавай песні «Жаваронačкі, прыляціце!».*

**VII. Дамашняе заданне.** Заданне на выбар: практ.6 (с. 6), практ. 4 (с. 5) або творчае заданне: знайсці ў інтэрнэце 2 любыя прыметы надвор’я, у якіх ёсць словы з прыстаўкамі.

***Данкевіч Тацццяна Васільеўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Нясвіжа»*

## Апостраф у словах з прыстаўкамі

***Мэта:*** засваенне правапісу апострафа ў словах з прыстаўкамі.
***Задачы:***
- замацоўваць уменне вызначаць прыстаўку і корань у словах;
- фарміраваць навык правапісу апострафа ў словах з прыстаўкамі;
- адпрацоўваць навык правапісу слоў з прыстаўкамі на з-(с-) і аб-, ад-, над-, пад-;
- ствараць умовы для развіцця звязнага маўлення;
- садзейнічаць выхаванню клапатлівых адносін да жывёл.

***Абсталяванне:*** кубік з пытаннямі, сігнальныя карткі са знакамі «!», «?», «+».

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Гульня «Куб».**

– Для таго, каб сёння мы маглі паспяхова засвоіць новы матэрыял, нам трэба праверыць веды пра састаў слова. Прапаную вам гульню «Куб» з кубікам, на кожнай грані якога ёсць пытанне:

- Якія часткі слова вы ведаеце?
- Што такое корань слова?
- Што такое канчатак?
- Чым адрозніваюцца аднакаранёвыя словы і формы слова?
- Што такое прыстаўка? Для чаго яна служыць?
- Калі ў словах пішацца апостраф?

**2.2. Чыстапісанне. Праверка дамашняга задання (практ. 37, с. 22).**

*Ее ЕЕее ЕЕЕ еее*

*Пер’е, надвор’е, вераб’і*

*Зімой вераб’і падбіраюць сваё пер’е – да моцных маразоў.*

– Як вы разумееце выраз «падбіраюць пер’е»? *(Распушыць пер’е, натапырыць пер’е)*. Чаму вераб’і так робяць?

– Што агульнага паміж словамі? *(Назоўнікі, словы з апострафам.)*

– Якое слова з апострафам вы сустрэлі ў дамашнім практыкаванні? *(Надвор’е).* Да якой групы сказаў вы далучылі сказ са словам *надвор’е* – прымаўкі або народныя прыметы? Чаму? Якія яшчэ сказы вы аднеслі да народных прымет?

– Чаму ў слове *надвор’е* пішацца апостраф? Прыдумайце іншыя словы з апострафам. Запішам слова *раз’езд.* Ці падыходзіць яно да нашага правіла? Чаму? *(Апостраф стаіць пасля прыстаўкі.)*

**IV. Азнаямленне з тэмай урока і пастаноўка задач урока.**

– Якая тэма нашага ўрока? Якія задачы мы павінны вырашыць сёння на ўроку? *(Умець вызначаць корань і прыстаўку ў словах. Ведаць, калі трэба пісаць апостраф у словах з прыстаўкамі.)*

**V. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 38 (с. 23).**

– Прачытайце слова. Да якой часціны мовы яно адносіцца?

– Утварыце пры дапамозе прыставак новыя словы. Якія словы атрымаліся? Назавіце іх адным словам. *(Аднакаранёвыя.)* Па якой прымеце іх можна падзяліць на дзве групы?

– Запішыце словы ў два слупкі. Выдзеліце ў словах прыстаўкі. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

**5.2. Стварэнне мадэлі новага правіла.**

– Калі яшчэ пішацца апостраф у словах?

*Настаўнік на дошцы выкладае мадэль правіла.*




– Вазьміце простыя алоўкі, прачытайце правіла на с. 23 і пазначце знакам «+» тое, што вы ведалі, знакам «–» тое, што было для вас новым.

**Фізкультхвілінка.**

**VI. Замацаванне новага матэрыялу.**

**6.1. Выкананне практыкавання 39 (с. 23).**

– Прачытайце словы. Што паміж імі агульнага? Запішыце толькі тыя словы, у якіх трэба пісаць апостраф. *(Узаемаправерка.)*

**6.2. Выкананне практыкавання 40 (с. 24).**

– Прачытайце верш. Чаму хлопчык напісаў аб’яву? Што ён у ёй указаў? Як адносіцца хлопчык да свайго гадаванца? Што мы можам сказаць аб характары хлопчыка?

– Выпішыце выдзеленыя словы. Раслумачце іх правапіс.

– Уявіце сабе, што вы знайшлі сабаку, які згубіўся. Напішыце аб’яву для яго гаспадара. *(Дзеці карыстаюцца падказкай на с. 24.)*

**6.3. Выкананне практыкавання 41 (с. 25).**

**VII. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Ці вырашылі мы задачы, якія ставілі ў пачатку ўрока? Калі пішацца апостраф у словах з прыстаўкамі? *(Зварот да мадэлі правіла.)*

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 42, с. 25, правіла, с. 23.

**IX. Рэфлексія.** Пры дапамозе сігнальных картак вучні даюць ацэнку сцвярджэнням: *«!» – ужо ведаў, «+» – новае, «?» – не зразумеў.*

- Апостраф пішацца ў сярэдзіне слова.
- Апостраф пішацца пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны.
- Апостраф пішацца калі паміж зычнымі і галоснымі е, ё, ю, я, і вымаўляецца гук [й].
- Апостраф пішацца перад літарамі е, ё, ю, я, і.

## Напісанне прыставак і прыназоўнікаў

***Мэта:*** фарміраванне навыку правапісу прыставак і прыназоўнікаў.
***Задачы:***
- удасканальваць уменне вызначаць прыстаўку ў словах;
- вучыць адрозніваць прыстаўкі ад прыназоўнікаў;
- садзейнічаць выхаванню павагі да мудрасці продкаў.

***Абсталяванне:*** словы-апоры (частка слова, асобнае слова, асобна, разам, для сувязі слоў у сказе, для ўтварэння новых слоў); карткі для работы ў парах «Складанне словазлучэнняў».

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**1.1. Гульня «Поспехаў табе!»**

– Пажадаем адзін аднаму поспехаў на ўроку. *(Вучні ланцужком жадаюць адзін аднаму поспехаў.)*

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Праблемная сітуацыя.**

– Я таксама жадаю вам поспехаў. Пачынаем працаваць:

– Ці змаглі вы дакладна выканаць дзеянні? Чаму? Якія словы ў маёй інструкцыі прапушчаны? *(На, у.)* Як называюцца гэтыя словы? *(Прыназоўнікі.)* Што такое прыназоўнік? Якія яшчэ прыназоўнікі вы ведаеце?

**2.2. Чыстапісанне.**

*Зз Дд Нн Пп*

*За да на па пад пра перад*

*... разумным ... добрае навучышся, а ... дурным – развучышся.*

– Што мы запісалі на другім радку? *(Прыназоўнікі. Прыстаўкі.)* Дакажыце.

– Прачытайце прыказку ў трэцім радку, дабаўляючы прыназоўнікі. Запішыце. *(**З** разумным **на** добрае навучышся, а **з** дурным – развучышся.)*

– Як трэба пісаць прыназоўнікі са словамі? Растлумачце сэнс прыказкі. Ці ёсць у сказе словы з прыстаўкамі. Вызначце ў словах прыстаўкі, падкрэсліце прыназоўнікі. Што мы ведаем пра правапіс прыставак? Вы ўжо здагадаліся над якой тэмай мы будзем працаваць сёння на ўроку? *(Будзем вучыцца адрозніваць прыстаўкі ад прыназоўнікаў і правільна іх пісаць.)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Рубрыка «Завяжы вузялок!» (с. 26).**

– Чым адрозніваецца прыстаўка ад прыназоўніка? Што рабіць, каб адрозніць прыстаўку і прыназоўнік?

**3.2. Выкананне практыкавання 44 (с. 26).**

*Калектыўная работа з каменціраваннем па першай частцы практыкавання, самастойная – па другой частцы.*

**3.3. Складанне словазлучэнняў.** *(Работа на картках у парах.)*

– На картках запісаны словы ў два слупкі, вам трэба ўтварыць славазлучэнні і запісаць іх.

| | |
|---|---|
| (па)бег | (да)вёскі |
| (на)крычаў | (па)дарозе |
| (пра)чытаў | (на)сабаку |
| (да)ехаў | (пра)касманаўтаў |

– Да якіх дзвюх груп можна аднесці словы ў словазлучэннях? *(І група – дзеясловы і назоўнікі; ІІ група – словы з прыстаўкамі і словы з прыназоўнікамі.)*

– Назавіце словы з прыстаўкамі. Як вызначылі прыстаўку ў слове?

– Назавіце словы з прыназоўнікамі. Як напісалі прыназоўнік з другім словам?

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 46 (с. 27).** *(Самастойна.)*

– Прачытайце прыказкі. Як вы разумееце іх сэнс. Знайдзіце словы з прыстаўкамі, прыназоўнікамі. Абгрунтуйце адказ. *(Узаемаправерка.)*

**4.2. Выкананне практыкавання 47 (с. 28).** *(Калектыўна.)*

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

**5.1. Складанне кластару.** На дошцы размешчаны карткі са словамі-апорамі: частка слова, асобнае слова, прыстаўка, прыназоўнік, асобна, разам, для сувязі слоў у сказе, для ўтварэння новых слоў.

Вучні выбіраюць сабе адно з двух слоў: *(на)пісаў, (на)дошцы.* Складаюць да яго кластар.






**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 48, с. 28.

**VII. Рэфлексія.**

– Вазьміце выявы твараў, якія ляжаць у вас на партах і дамалюйце **нос** з дапамогай знакаў прыпынку:

«**!**» – калі вы добра зразумелі тэму і самастойна выконвалі заданні;

«**?**» – калі вы не зусім добра зразумелі тэму і ў вас ёсць пытанні.

Намалюйце **рот** сімвалам:

 *– задаволены сваёй працай;*

 *– не зусім задаволены сваёй працай;*

 *– не задаволены сваёй працай.*

## Суфікс

***Мэта:*** фарміраванне паняцця пра суфікс як значымую частку слова, яго ролі ў слове.

***Задачы:***

- вучыць знаходзіць суфіксы ў словах і графічна іх абазначаць;
- стварыць умовы для развіцця мыслення навучэнцаў, узбагачэння іх слоўнікавага запасу словамі з памяншальна-ласкальным адценнем;
- садзейнічаць выхаванню ўважлівага стаўлення да слова.

***Абсталяванне:*** карткі з пытаннямі для гульні «Скрынка ведаў».

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Гульня «Скрынка ведаў».** Вучні дастаюць карткі з пытаннямі са скрынкі і адказваюць на іх:

- Якія словы мы называем роднаснымі?
- Як яшчэ называюцца роднасныя словы?
- Што такое корань слова?
- Што такое прыстаўка?
- Як адрозніць прыстаўку ад прыназоўніка?
- Чым адрозніваюцца аднакаранёвыя словы ад формы слова?
- Для чаго служыць канчатак?
- Для чаго служыць прыстаўка?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*е а у я е у*

– Якія літары запісаны на дошцы? *(Галосныя.)* На якія дзве групы можна іх падзяліць? *(Абазначаюць адзін гук, могуць абазначаць два гукі.)*

– Запішыце іх у сшыткі.

*Б_з н_в_к _к б_з р_к.*

– Якія літары запісаны? Назавіце літары, якія абазначаюць звонкія зычныя гукі, глухія зычныя гукі.

– Гэта не проста літары. Тут зашыфравана прыказка. Каб яе расшыфраваць, трэба ўставіць галосныя літары.

*Без навук як без рук.*

– Як вы разумееце яе сэнс? Запішыце яе ў сшытկі, і гэта прыказка будзе дэвізам нашага ўрока.

**3.2. Уводзіны ў тэму ўрока.**

– Назавіце і выпішыце з прыказкі словы, якія абазначаюць прадметы. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы. *(Навука – навучны, навуковец. Рука – ручка, ручны, наручны, ручнік.)* Выдзеліце ў іх корань і канчатак. Назавіце словы, якія ўтварыліся пры дапамозе прыставак. Што вы заўважылі? *(Не ўсе словы ўтварыліся пры дапамозе прыстаўкі.)* Хто ведае, што гэта за частка слова?

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

– З чым мы будзем знаёміцца на ўроку? *(З новай часткай слова.)* Дапоўніце сказ, каб вызначыць задачы ўрока:

пазнаёміцца _________;
даведацца ___________;
вучыцца ____________.

**4.1. Выкананне практыкавання 49 (с. 29).** *(Калектыўна.)*

– Запішыце словазлучэнні з аднакаранёвымі словамі. Выдзеліце ў іх корань і канчатак. Знайдзіце частку, пры дапамозе якой атрымаліся новыя словы. Раскажыце пра гэтую частку слова па алгарытме:

*стаіць _____;*
*служыць ______;*
*абазначаецца ______.*

**4.2. Работа з правілам на с. 30.**

– Параўнайце адказ з правілам. (*Можна звярнуцца да інтэрнэт-рэсурса: https://www.skarnik.by/tsbm/81363)*

– Звярніце ўвагу: суфікс знаходзіцца паміж коранем і канчаткам. Як мы будзем знаходзіць суфікс у слове?

**Фізкультхвілінка.**

**V. Замацаванне новага матэрыялу.**

– Прачытайце верш «Маміна дачушка» *(Н. Тулупава).*

Гэта – вочкі,
Гэта – носік,
Гэта – роцік,
Гэта – вушкі,
Гэта – маміна дачушка! [5, с. 555]

– Спішыце верш. Ва ўсіх словах, акрамя слова *гэта,* абазначце канчатак, корань і суфікс. *(Калектыўная праверка.)*

**5.1. Выкананне практыкавання 50 (с. 30).** (*Работа ў парах.)*

**5.2. Азнаямленне з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 31).**

**5.3. Выкананне практыкавання 51 (с. 30).**

**5.4. Выкананне практыкавання 53 (с. 32)** *(самастойна).*

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

– З якой часткай слова мы сёння пазнаёміліся? Раскажыце пра суфікс па нашым алгарытме:

*стаіць _____;*

*служыць ______;*

*абазначаецца ______.*

– Што вам было цікава на ўроку? У якіх сітуацыях паўсядзённага жыцця нам спатрэбяцца атрыманыя на ўроку веды?

**VII. Дамашняе заданне.** Практ. 54, с. 32.

***Бурко Алена Аляксандраўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА«Нарацкая сярэдняя школа № 2» Мядзельскага раёна*

## Агульнае паняцце пра самастойныя і службовыя часціны мовы

***Мэта:*** азнаямленне з асноўнымі прыметамі самастойных і службовых часцін мовы (значэнне, пытанні, роля ў сказе).

***Задачы:***

- даць уяўленне пра назвы часцін мовы (назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыназоўнік);
- практыкаваць у распазнаванні назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, прыназоўнікаў у сказах і тэкстах;
- садзейнічаць развіццю ў вучняў лагічнага мыслення, фантазіі, вуснага звязнага маўлення;
- спрыяць выхаванню эстэтычных пачуццяў да прыроды, зацікаўленасці да вывучэння роднай мовы.

***Абсталяванне:*** «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (для вучняў), «Толковый словарь русского языка» (для настаўніка), мультымедыйная ўстаноўка (інтэрактыўная дошка) з выхадам у інтэрнэт або карткі са словамі «4 слупкі», карткі з крыжаванкай для гульні «Перакладчыкі» (для вучняў).

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

– Што значыць для вас урок беларускай мовы? Назавіце словы-асацыяцыі, якія адказваюць на пытанне *што? (Веды, радасць, праца і г.д.)* Якім, па-вашаму, павінен быць урок? Назавіце словы – прыметы ўрока. *(Цікавы, сучасны, незвычайны і г. д.)* Як вы лічыце, якія дзеянні мы будзем выконваць на ўроку? *(Пісаць, слухаць, размаўляць*

*і г. д.)* Колькі розных слоў-асацыяцый звязаны з урокам беларускай мовы! Я жадаю вам поспехаў і карыснай працы!

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Арфаграфічная размінка.**

– Прачытайце сказ на дошцы. Знайдзіце і выпраўце памылкі. Растлумачце іх.

*Па узлесках бялеюць тонкія бяроскі, каля вёскі раскінувся шырокі луг.*

– Назавіце словы: назвы прадметаў, назвы прымет прадметаў, назвы дзеянняў. На якія пытанні адказваюць гэтыя словы? Якія словы ў сказе не называюць прадметы, прыметы і дзеянні? Ці можна да іх паставіць пытанне? Паразважайце, што было б, каб гэтых слоў не існавала.

**2.2. Чыстапісанне.**

*П п П п П п П п*

*пыл пыльны пыліцца*

– Здагадайцеся, з якой літарай мы будзем працаваць на чыстапісанні, калі яна абазначае глухі зычны гук, парны гуку [б]. Запішыце ў сшытках, чаргуючы літары *П, п*.

– Запішыце словы другога радка на гэту літару. Што агульнага ў гэтых слоў? *(Звязаны па значэнні, аднакаранёвыя.)* Абазначце ў іх корань. Якое з дадзеных слоў абазначае дзеянне (прадмет, прымету прадмета)? На якія пытанні адказваюць?

– Растлумачце слова *пыл* з дапамогай тлумачальнага слоўніка. Што значыць выраз «пусціць пыл у вочы»? *(Хваліцца, хлусіць, паказаць сябе з найлепшага боку.)* Ці ёсць слова *пыл* у рускай мове? Што яно абазначае? Звернемся да тлумачальнага слоўніка рускай мовы Ожэгава С. І.

– Запомніце значэнне гэтага слова ў беларускай і рускай мовах для правільнага выкарыстання.

**2.3. Гульня «Перакладчыкі»** *(на картках).*

– Перакладзіце слоўнікавыя словы на беларускую мову і запішыце іх у крыжаванку: 1) открыть (двери); 2) счастье; 3) светить; 4) звенеть; 5) дневник; 6) пенал; 7) тетрадь; 8) медаль; 9) почта; 10) паук; 11) выйти.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1. а | д | ч | ы | н | і | ц | ь | |
| | | | 2. ш | ч | а | с | ц | е | | | |
| | | | | | 3. с | в | я | ц | і | ц | ь |
| 4. з | в | і | н | е | ц | ь | | | | | |
| 5. д | з | ё | н | н | і | к | | | | | |
| | | | 6. п | е | н | а | л | | | | |
| | | | 7. с | ш | ы | т | а | к | | | |
| | | | | | 8. м | е | д | а | л | ь | |
| | | | | 9. п | о | ш | т | а | | | |
| | | | 10. п | а | в | у | к | | | | |
| | | | | 11. в | ы | й | с | ц | і | | |

– Назавіце словы – назвы прадметаў, дзеянняў. Прачытайце ключавыя словы. *(Часціны мовы.)* Хочаце даведацца, што яны абазначаюць?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.**

– Паспрабуйце вызначыць тэму сённяшняга ўрока. *(Вучні выказваюць свае меркаванні.)* Сёння мы даведаемся, як называюцца часціны мовы і вызначым іх асноўныя прыметы.

**3.2. Размеркаванне слоў у чатыры слупкі.**

– Падзяліце словы на чатыры слупкі.

Ссылка на інтэрактыўнае заданне:

https://learningapps.org/5615188

(Можна выконваць на інтэрактыўнай дошцы перацягваннем слоў або прымацоўваць карткі са словамі «4 слупкі»).

*Дарога, зімаваць, за, снежань, папера, над, маляваць, ад, блакітны, аловак, зімовы, пад, смяяцца, вясёлы, усмешка, каля, ранішні, крычаць.*

– Растлумачце свой выбар. Прачытайце словы – назвы прадметаў (прымет, дзеянняў). Якія словы засталіся? Якая назва падыходзіць да слоў кожнага слупка: назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, прыназоўнікі? Назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, прыназоўнікі – гэта часціны мовы.

**3.3. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 45).**

– Прачытайце матэрыял рубрыкі «Завяжы вузялок!» у падручніку.

– Што такое часціны мовы? Назавіце іх.

**3.4. Работа з дэфармаваным сказам.**

Інтэрактыўнае практыкаванне або карткі-словы (https://learningapps.org/watch?v=phw9is9k318)

– Перастаўце словы ў такім парадку, каб атрымаўся сказ. *(Цёплай вясной птушкі вяртаюцца ў родныя гнёзды.)*




– Запішыце сказ. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Пастаўце пытанні да дадзеных членаў сказа. Назавіце словы – назвы прадметаў (прымет, дзеянняў). Якімі членамі сказа яны з'яўляюцца? Якая роля розных часцін мовы ў сказе?

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Распазнаванне розных часцін мовы, вызначэнне іх ролі ў сказах.** Самастойна выконваем практ. 75, с. 45. *(Узаемаправерка.)*

**4.2. Развіццё маўлення.**

– Ці адпавядае малюнак зместу верша з практыкавання 77, с. 46.

– Апішыце свае «фотаздымкі лесу», выкарыстоўваючы па чарзе толькі адну групу слоў: словы – назвы прадметаў (прымет, дзеянняў). Што вы заўважылі? Калі б вы былі фотакарэспандэнтамі, што б вы сфатаграфавалі на вуліцы вясной?

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Аб чым вы даведаліся на ўроку? Задайце пытанні аднакласнікам па новай тэме з апорай на схему.




– Пералічыце якасці чалавека пры дапамозе слоў – назваў прадметаў, прымет, дзеянняў.

**VI. Дамашняе заданне.** Практ. 78, с. 47, правіла на с. 45.

***Бруцкая Наталія Аляксееўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Сярэдняя школа № 7 г. Барысава»*

# Назоўнік як часціна мовы

***Мэта:*** абагульненне і ўдакладненне ведаў пра назоўнік як часціну мовы.
***Задачы:***
- удакладніць прыметы назоўніка, практыкаваць у вылучэнні назоўнікаў па характэрным прыметам сярод іншых часцін мовы;
- выпрацоўваць уменне адрозніваць назоўнікі, якія адказваюць на пытанні *хто?* або *што?*;
- назіраць за роляй назоўнікаў у сказе;
- узбагачаць слоўнік назоўнікамі-сінонімамі;
- развіваць мысленне, звязнае маўленне;
- выклікаць эмацыянальныя пачуцці прыхільнасці да Радзімы.

***Абсталяванне:*** выява «цікаўнае воблачка» (для дошкі); карткі для слоўнікавай работы «Воблака» (для вучняў); схема «Часціны мовы»; карткі-схемы «Назоўнік» (для дошкі), аўдыёзапіс беларускага народнага танца ў выкананні аркестра цымбалістаў; карткі для рэфлексіі (для работы ў парах); рознакаляровыя лісты (для групы).

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Чыстапісанне.** Запіс складоў на дошцы адбываецца па чарзе.

*Во об бл ла ак ка*

– Адгадайце загадку: «Што без вады плавае?». *(Воблака.)* Знайдзіце на картачцы правільны запіс адгадкі на беларускай мове.

(https://drive.google.com/open?id=1pm9foE-Oh1vgXvaEk-M1X5ZBsaCTy4-ke)




– Ці ёсць сярод дадзеных слоў пераклад на рускую мову слова *воблака*? Знайдзіце розніцу ў напісанні гэтых слоў. Запішыце слова *воблака*, падзяліце яго для пераносу.

*воблака воб-ла-ка во-бла-ка*

– Знайдзіце і запішыце форму слова *воблака*. Дакажыце, што гэта форма слова. Знайдзіце і запішыце аднакаранёвае слова. Дакажыце, што гэта аднакаранёвае слова.

*воблака воблакі воблачка*

– Знайдзіце на картачцы словы, якія апісваюць воблака, і запішыце з імі адно словазлучэнне ў наступным радку чыстапісання.

– Знайдзіце памылкі ў сказе, запішыце яго правільна.

*Панебе пра плывало белюсенькая аблачка.*

**2.2. Работа па схеме.**

– Якія часціны мовы вы ведаеце?

– Чым адрозніваюцца паміж сабой часціны мовы? *(Значэннем у мове і пытаннямі.)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.** *(Работа ў парах.)*

**3.1. Складанне схемы «Назоўнік».**

– Сёння на ўроку больш падрабязна мы разгледзім адну з часцін мовы. Дапаможа нам вось гэта «цікаўнае воблачка». Яно лятала, усё разглядала. А вось што яно бачыла, вам трэба здагадацца па апісанні і запісаць на месцы пропускаў.

*Падляцела воблачка да **расліны.** Яна была блакітнай, з пяшчотнымі пялёсткамі, мела прыемны пах. **Што** гэта?* __________

*Потым яно ўбачыла **насякомае**, паласатае, якое лятала ад кветкі да кветкі і гудзела. **Хто** гэта?* ____________

*Ад гэтага ў яго ўзніклі вясёлыя **пачуцці**. **Што** гэта?*____________

*А потым адбылася **прыродная з'ява:** наляцеў вецер, хмары, загрымеў гром. **Што** гэта?*___________

– Якія словы вы ўставілі? Што абазначаюць гэтыя словы?

*На дошцы паэтапна запаўняецца схема.*

*I этап*




*II этап*




– Якія пытанні мы ставілі да гэтых слоў?

*III этап*




– Што абазначаюць словы, якія адказваюць на пытанне *хто?* або *што?* Як называецца часціна мовы, якая абазначае предмет і адказвае на пытанне хто? або што?

*IV этап*




**3.2. Работа з правілам на с. 48.**

– Мы даведаліся пра характэрныя прыметы назоўніка. Ці дапаможа нам гэта вылучаць назоўнікі сярод іншых часцін мовы? Як вы думаеце, якая мэта нашага ўрока? *(Адрозненне назоўнікаў сярод іншых часцін мовы.)* Яшчэ мы будзем вучыцца адрозніваць паміж сабой назоўнікі, якія адказваюць на пытанні *хто?* або *што? (Работа ў групах.)*

– Сярод слоў трэба выбраць толькі назоўнікі. *(Словы запісаны на рознакаляровых лістах, усе назоўнікі – на лістах аднаго колеру.)*

– Праверым. Калі ўсе словы, якія выбрала група, на паперах аднаго колеру – значыць заданне выканалі правільна. Але я бачу, што ў розных груп атрымаліся розныя колеры. Праверым, хто памыліўся. *(Вызначаюць, што ўсюды назоўнікі.)* Чым адрозніваюцца словы? *(Ставім розныя пытанні: да назваў людзей і жывёл – хто?, да ўсіх астатніх слоў – што?)*

Дадатковымі стрэлачкамі гэты вынік адлюстроўваецца на схеме.

**Фізкультхвілінка.**

**VI. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Выкананне практыкавання 80 с. 48.** *(Замацаванне ўмення размяркоўваць назоўнікі на адушаўлёныя і неадушаўлёныя.)*

**4.2. Работа з рубрыкай «Гаварыце правільна» (с. 49).**

**4.3. Выкананне практыкавання 81 с. 49.** *(Назіранне за роляй назоўнікаў у сказах.)*

**4.4. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 49).**

**4.5. Выкананне практыкавання 82 (с. 50).** *(Развіццё мовы – падбор сінонімаў.)*

**4.6. Выкананне практыкавання 83 (с. 50).** *(Развіццё мыслення, звязнага маўлення, вырашэнне выхаваўчай задачы.)* Гучыць аўдыёзапіс мелодыі беларускага народнага танца ў выкананні аркестра цымбалістаў.

**V. Падвядзенне вынікаў урока.** *(Работа ў парах.)*

– Адгадайце загадку *(М. У. Анцух)*:

Спытай мяне:  
– Хто ці што гэта?–  
І дам я назвы ўсім прадметам,  
Усім паняццям, розным з’явам, –  
Гатоў служыць заўсёды я вам. *(Назоўнік.)* [4, с. 23]

**VI. Рэфлексія.** Абмяркуйце ў парах, якое слова «лішняе» ў кожным радку, закрэсліце яго. Назавіце прымету, якая аб’ядноўвае астатнія словы.

*Картка рэфлексіі*

*1) Рабіна, лісце, туман, восеньскі, яблыкі.*

*2) Кефір, цукар, лыжка, кубак, рыба.*

*3) Футбаліст, спартсмен, шайба, хакеіст.*

**VII. Дамашняе заданне.** Практ. 85 (с. 51).

## Адзіночны і множны лік назоўнікаў

***Мэта:*** азнаямленне са змяненнем назоўнікаў па ліках.

***Задачы:***

- знайсці спосаб вызначаць лік назоўнікаў;
- практыкаваць ва ўтварэнні форм множнага ліку;
- развіваць мысленне, вобразнае ўяўленне;
- выхоўваць эстэтычныя пачуцці да цыркавога майстэрства.

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання.**

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*Цңц цы цо цы*

– Што мы ведаем пра гукі, якія абазначаюцца літарай *ц*?

*Цырк цыркачы цыркавы*

– Што агульнага ў словах? *(Аднакаранёвыя словы.)* Вызначце склад слова. Якія два словы можна аб’яднаць, па якой прымеце? *(Цырк, цыркачы – назоўнікі).* Чым яны адрозніваюцца? *(Адно слова адказвае на пытанне што?, другое – на пытанне хто?)*

**3.2. Арфаграфічная хвілінка.**

– Устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце іх напісанне.

*Мы (у, ў)чора (з)ба..ькамі ха..ілі (у, ў)ц..рк.*

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Работа па малюнку.**

– Мы ўсе любім цырк. Чым ён нас прываблівае? Прапаную вам сёння цыркавое выступленне. А галоўным артыстам будзе Назоўнік. Спачатку ўспомніце ўсё, што ведаеце пра гэту часціну мовы.

– Разгледзьце малюнкі (практ. 86). Якія прадметы паклаў фокуснік у капялюш? Якія дастаў? Што чароўны капялюш з імі зрабіў? *(Памножыў.)* Што змянілася? *(Лік прадметаў. Быў 1 мяч – стала 2, была 1 стужка – стала 4.)* Быў адзін прадмет, а стала – многа.

– Запішам гэты цуд у свае сшыткі словамі. Якія часціны мовы нам спатрэбяцца, каб абазначыць гэтыя прадметы? *(Назоўнікі.)*

– Што здарылася з назоўнікамі: мяч – мячы, стужка – стужкі? *(Змяніўся лік.)* Які вынік можна зрабіць? *(Назоўнікі могуць змяняцца па ліках).* Гэта аднакаранёвыя словы ці формы аднаго слова? *(Формы.)* Як назавём такую форму назоўніка? *(Адзіночная.)* А якая форма абазначае многа прадметаў? *(Множная.)* Што новага даведаліся пра назоўнік? Параўнайце з правілам у падручніку.

– Давайце вызначым мэту нашага ўроку, чаму будзем вучыцца? *(Адрозніваць назоўнікі ў форме адзіночнага і множнага ліку; змяняць форму адзіночнага на множны і наадварот.)*

**V. Замацаванне вывучанага на ўроку.**

**5.1. Выкананне практыкавання 90 (с. 54).** Выпішыце назоўнікі ў два слупкі ў адпаведнасці з лікам. Параўнайце і вызначце канчаткі множнага ліку.

**5.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 53).**

**5.3. Выкананне практыкаванняў.** Утварыце формы множнага ліку назоўнікаў па ўзоры практ. 87, 88 (с. 53).

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**VII. Рэфлексія.**

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 91, с. 55.

***Сазонава Вольга Уладзіміраўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Сярэдняя школа № 23 г. Барысава»*

# Прыметнік як часціна мовы

***Мэта:*** абагульненне і ўдакладненне ведаў пра прыметнік як часціну мовы.

***Задачы:***

- удакладніць прыметы прыметніка, яго сувязь з назоўнікам і ролю ў тэксце;
- практыкаваць у вылучэнні прыметнікаў па характэрным прыметам сярод іншых часцін мовы;
- узбагачаць слоўнік прыметнікамі-антонімамі; развіваць звязнае маўленне;
- назіраць за роляй прыметнікаў у сказе;
- выхоўваць культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** літары-абрысы У, С, Г, Ь (на дошку); карткі са словамі: *дзікія, гусі, ляцяць, доўгім, ланцужком;* картка № 1 (для вучняў); картка № 2 (для работы ў парах), карткі са словамі: *які, што, якая, прымета прадмета, дзеянне, частка, даданы член сказа, галоўны член сказа, прадмет, якое, часціна, што рабіць* (на дошку).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Чыстапісанне.**

– Хто лічыць сябе смелым чалавекам?

Да дошкі выходзяць 4 вучні з завязанымі вачыма, якія павінны адгадаць на вобмацак, абрысы якіх літар трымаюць у руках. *(У, С, Г, Ь)* Настаўнік паслядоўна прапісвае на дошцы літары, вучні – у сшытках.

*у с г ь*

– Складзіце з гэтых літар слова. *(Гусь.)*

*Гусь гусь гусіны*

– Вызначце род слова, падбярыце да яго слова – назву прыметы прадметаў. *(Паступова словы запісваюцца на дошцы настаўнікам.)*

– Складзіце сказ са слоў, якія размешчаны на дошцы, запішыце:

ЛАНЦУЖКОМ ГУСІ ЛЯЦЯЦЬ *(Гусі ляцяць ланцужком.)*

– Дапоўніце сказ наступнымі словамі: ДОЎГІМ ДЗІКІЯ. *(Дзікія гусі ляцяць доўгім ланцужком.)* Запішыце атрыманы сказ.

– Куды ляцяць гусі? *(У вырай або вяртаюцца на радзіму.)*

– Падкрэсліце граматычную аснову. Што абазначаюць устаўленыя словы? Успомніце, што ведаеце пра словы – назвы прымет прадметаў.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Гульня «Пазнай прадмет па апісанні».** *Настаўнік чытае прыметы ў практ. 132 (с. 78), вучні адгадваюць назву жывёлы.*

– Пастаўце вусна пытанні ад назоўнікаў да слоў – назваў прымет прадметаў. Як вы лічыце, якім словам будзе прысвечаны наш урок? Што мы пра іх ужо ведаем? Аб чым магчыма даведаемся?

**3.2. Работа з правілам.**

– Прачытайце правіла на с. 79 і дапоўніце сказы ў картцы.

Картка № 1

*Словы, якія абазначаюць ________ ________ і адказваюць на пытанні ________ __________ __________ _________, – гэта _________________.*

**Фізкультхвілінка.**

**IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**4.1. Гульня «Адшукай слова».** *(Работа ў парах.)*

– Адшукайце на картцы № 2 розныя формы слова *цёплы* і ўстаўце ў сказы практ. 133 (с. 79).

Картка № 2

КРЧБЫД

ЦЁПЛАЕРВД (цёплае )

БЫФЭУКЛЕГЗХ

ЮЧДЯЗЦЁПЛЫГКТ (цёплы)

НЯЎЦДЦЁПЛЫМІКДЭ (цёплымі)

ВАРГШМНОЧОРВАП

ЫВАГПГСЧРМІОЛУ

ОРГШЦЁПЛУЮВ (цёплую)

ДШОРГНХЫ

– Адзін сказ на выбар запішыце ў сшытак. Разбярыце яго па членах сказа. З якім словам у сказе звязаны прыметнік? Якім членам сказа з’яўляецца прыметнік?

**4.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок!» (с. 79).**

– З чым звязаны прыметнік у сказе? Якім членам сказа ён бывае часцей?

**4.3. Выкананне практыкавання 134 с. 79.**

– Прыдумайце сказы, якія адпавядаюць прапанаваным схемам. Колькі даданых членаў будзе ў сказе? На якое пытанне адказвае даданы член сказа, які паясняе дзейнік? На якое пытанне адказвае даданы член сказа, які паясняе выказнік? На якое яшчэ пытанне адказвае даданы член сказа і што ён дапаўняе? *(Настаўнік запісвае больш удалы сказ на дошцы і вучні ў сшытках.)*

– Назавіце прыметнікі. *(Настаўнік паказвае графічнае абазначэнне прыметнікаў на пісьме.)*

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу.**

**5.1. Выкананне практыкавання 135 (с. 80).** Вусна падбярыце антонімы да прапанаваных прыметнікаў і злучыце іх:

*высокі* *вузкі*
*белы* *кароткі*
*шырокі* *маленькі*
*вялікі* *нізкі*
*тоўсты* *чорны*
*доўгі* *тонкі*

– Запішыце тры сказы на выбар, выкарыстайце гэтыя словы і параўнайце прадметы па прыметах. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў.

**5.2. Работа са слоўнікавым словам.**

– Якое слова схавалася ў шыфроўцы: DПSJЯQCZNЧFVAHYWЫ? *(Пясчаны.)* Выканайце практ. 136 (с. 81).

– Да назоўнікаў з правага слупка падбярыце прыметнікі з левага слупка. Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія падыходзяць па сэнсе. Запішыце сказ, у якім ёсць слоўнікавае слова.

**5.3. Падбор да назоўнікаў прыметнікаў з групы сінонімаў, практ. 137 (с. 81).** Знайдзіце ў кожным радзе прыметнікаў лішні. Дапоўніце сказы словамі першай групы і запішыце іх.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы прымацаваны словы і спалучэнні слоў: *які, што, якая, прымета прадмета, дзеянне, частка, даданы член сказа, галоўны член сказа, прадмет, якое, часціна, што рабіць.*

– Пакіньце на дошцы толькі тыя словы, якія адносяцца да тэмы нашага ўрока. Раскажыце, карыстаючыся гэтымі словамі, што ведаеце пра прыметнік.

**VIII. Рэфлексія. Гульня «Мой мяч».** *(Работа ў групах.)*

– Адгадайце загадку:

Я аздабляю нашу мову:
Даю прыметы розным словам.
Наўрад ці можаш без мяне ты
Прадмет адрозніць ад прадмета. *(М. У. Анцух)* [4, с. 26]

– Праверым, ці дапамогуць прыметнікі вызначыць прызначэнне мяча па 4 прыметах.

Настаўнік характарызуе мячы па памеры, колеры, матэрыяле, паверхні: дзіцячы, футбольны, малы тэнісны (пінг-понг), вялікі тэнісны, валейбольны, баскетбольны, ватэрпольны, бейсбольны, рэгбі, гандбол, гольф, більярд, боўлінг, крыкет.

Вучні адгадваюць. За кожны правільны адказ налічваецца па 4 балы.

**VII. Дамашняе заданне.** Практ. 138, с. 82.

## Змяненне прыметнікаў па родах

***Мэта:*** азнаямленне са змяненнем прыметнікаў па родах.
***Задачы:***
- даць агульнае ўяўленне пра змяненне прыметнікаў па родах;
- садзейнічаць развіццю маўлення вучняў; узбагачаць слоўнік прымаўкамі;
- выхоўваць ветлівасць.

***Абсталяванне:*** прадметныя малюнкі: *сэрца, воблака, відэлец, лыжка* (на дошку); карткі № 1, № 2, № 3 з 3 тэкстамі *(для работы вучняў па 3 варыянтах)* карткі № 4, 5 (для вучняў), мультымедыйная ўстаноўка з выхадам у інтэрнэт або карткі: *густы туман, доўгая дарога, цёплае сонейка, летні дзень, старое дрэва, лясны жыхар, празрыстае возера, жвавая вавёрка, працавітая мурашка, асенняе ўбранне* (на дошку).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

**II .Чыстапісанне.**

*Сс Вв Сэрца*
*сэрца воблака відэлец лыжка*

На дошцы малюнкі: сэрца, воблака, відэлец, лыжка.

– Запішыце ў сшыткі словы, якія называюць прадметы на малюнках. *(Работа ў парах.)* Складзіце з адным са слоў сказ, каб у ім абавязкова быў прыметнік. Запішыце найбольш удалы сказ на дошцы і ў сшытках. Падкрэсліце граматычную аснову.

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Выкананне задання на картках.** *(Работа ў парах.)*

*Кожны рад атрымлівае свой тэкст і схему сказа.*

– Знайдзіце ў тэксце сказ, які адпавядае схеме, і выпішыце яго. Падкрэсліце ў гэтых сказах спалучэнне *прыметнік + назоўнік.*

КАРТКА № 1

*Лена вельмі любіць чытаць кнігі. Дзяўчынка беражэ кнігі. За добрую вучобу яна атрымала кнігу. Прыгожая кніга зацікавіла Лену.*



КАРТКА № 2

*Вакол вёскі сасновы бор. Я любіў летам адпачываць пад вялікай сасной. Прыгожае дрэва ратавала ад спякоты.*




КАРТКА № 3

*На беразе стаіць прыгожы дом. Вакол квітнее сад. Над кветкамі гудуць пчолы.*




Падкрэсленыя словазлучэнні вучні выпісваюць на дошку ў слупок: *прыгожая кніга, прыгожае дрэва, прыгожы дом.*

– Выдзеліце канчаткі. Чаму яны змяніліся? Абазначце род і лік назоўнікаў у спалучэннях слоў. Пастаўце пытанне ад назоўнікаў да прыметнікаў. Які вывад мы можам зрабіць пра злучэнне прыметніка і назоўніка? Чаму мы прысвецім сённяшні ўрок?

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Работа з правілам.**

– Прачытайце самастойна правіла на с. 83 падручніка і на картцы № 4 выпраўце памылкі, якія там дапушчаны.

КАРТКА № 4

*Прыметнікі не змяняюцца па родах. Прыметнікі звязаны з назоўнікамі ў тым жа родзе і ліку, што і назоўнікі.*

**V. Замацаванне вывучанага.**

**5.1. Размеркаванне прыметнікаў па роду назоўнікаў.**

*Інтэрактыўнае практыкаванне «Род прыметнікаў»: https://learningapps.org/5766817*

– Размяркуйце іх па роду назоўнікаў на дошцы:

| *ж. р.* | *н. р.* | *м. р.* |
|---|---|---|
| *прыгожая кніга* | *прыгожае дрэва* | *прыгожы дом* |

*Густы туман, доўгая дарога, цёплае сонейка, летні дзень, старое дрэва, лясны жыхар, празрыстае возера, жвавая вавёрка, працавітая мурашка, асенняе ўбранне.*

**5.2. Работа з табліцай практ. 140 (с. 83).**

– Паглядзіце на дошку і ў падручнік. На якія пытанні адказваюць прыметнікі ў форме мужчынскага, жаночага і ніякага роду? Якія маюць канчаткі? У форме якога ліку ўжыты назоўнікі ў спалучэннях слоў?

**5.3. Размеркаванне спалучэнняў слоў па пэўных схемах.** *(Работа ў парах.)* Вучням раздаюцца карткі № 5, на якіх тры схемы.

– Пастаўце пытанне ад назоўніка да прыметніка і запішыце яго над стрэлкай. Размяркуйце па слупках (пад пэўнай схемай) спалучэнні слоў з практ. 141. Вызначце канчатак назоўнікаў.

КАРТКА № 5

*... ?   ... ?   ... ?*

*(м. р.)   (ж. р.)   (н. р.)*

**5.4. Выкананне практ. 142 (с. 84).**

– Прачытайце загадкі. З літар, якія «схаваліся» на малюнку, складзіце адгадкі. Якія прыметнікі дапамаглі вам знайсці адгадкі? Вызначце іх род, абазначце канчаткі. Спішыце адну загадку на выбар.

**5.5. Выкананне задання практ. 143 (с. 85).**

– Прачытайце і запішыце прыказку, карыстаючыся падказкай. Чаму так гавораць? Знайдзіце ў прыказцы прыметнік. З якім назоўнікам ён звязаны? Вызначце род прыметніка, абазначце яго канчатак.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**VII. Дамашняе заданне.** Практ. 144 (с. 85).

***Жылко Ала Уладзіміраўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Беларускамоўная гімназія № 2 г. Барысава»*

## Дзеяслоў як часціна мовы

***Мэта:*** абагульненне і ўдакладненне ведаў пра дзеяслоў як часціну мовы.

***Задачы:***

- удакладніць прыметы дзеяслова, практыкаваць у вылучэнні дзеясловаў па характэрных прыметах сярод іншых часцін мовы;
- выпрацоўваць уменне знаходзіць дзеяслоў у сказах і вызначаць яго сінтаксічную ролю;
- развіваць звязнае маўленне вучняў;
- назіраць за роляй дзеясловаў у сказе;
- узбагачаць слоўнік дзеясловамі-амонімамі.

***Абсталяванне:*** аўдыё-, відэазапіс песні «Дзед-барадзед» з тэлеперадачы «Калыханка» (словы А. Вольскага, музыка Л. Захлеўнага); канверт з заданнем ад Дзеда-барадзеда, карткі з дзеясловамі (для дошкі).

### *Ход урока*

*Клас атрымлівае канверт з заданнем ад Дзеда-барадзеда. Гучыць аўдыё-, відэазапіс аднаго куплета песні «Дзед-барадзед» з тэлеперадачы «Калыханка»: «Я хаджу па белым свеце і гляджу, як вы жывеце. Калі трэба памагу, бо я ўсё рабіць магу».*

– Ці здагадаліся, хто даслаў нам ліст? *(Казачны герой Дзед-барадзед.)* Настаўнік адкрывае канверт з заданнем і чытае ліст:

– Паважаныя вучні! Я знайшоў цудоўную прымаўку. Складзіце яе, яна стане дэвізам для сённяшняга ўрока і дапаможа вызначыць тэму і мэту ўрока.

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Гульня «Аднаві прымаўку».** *Калектыўная работа. На дошцы запісваецца аснова прымаўкі і ніжэй прымацоўваюцца словы для даведак:*

Хто ________, той не _________, хто _________, той __________.

***Словы для даведак:*** пытае, шукае, блудзіць, знаходзіць.

Адказ: *«Хто пытае, той не блудзіць, хто шукае, той знаходзіць».*

– Хто – гэта мы з вамі. А вось, што сёння мы шукаем, будзем даведвацца

**2.2. Чыстапісанне.**

*Ш ш Шш*

*Што? Што?*

*Што рабіць? Што зрабіць?*

– Калі мы карыстаемся такімі пытаннямі? *(Калі вызначаем словы, якія абазначаюць дзеянні.)*

**2.3. Работа з тэкстам (калектыўная работа)**

– Прачытайце навіны ад Дзеда-барадзеда.

*Вясна*

*Доўгачаканая вясна. Яркае сонейка. Працавітыя пчолы. Прыгожыя кветкі. На дрэвах лісточкі.*

– Ці падабаецца такі тэкст-апісанне? З якіх часцін мовы складаюцца сказы гэтага тэксту? *(Назоўнікаў, прыметнікаў.)* Якія словы могуць ажывіць нерухомыя карціны прыроды? *(Словы – назвы дзеянняў.)* Дапоўніце сказы адпаведнымі словамі – назвамі дзеянняў, якія падыходзяць па сэнсе, дапамажыце Дзеду-барадзеду.

*Вясна*

*Наступіла доўгачаканая вясна. Засвяціла яркае сонейка. Загулі працавітыя пчолы. Расцвілі прыгожыя кветкі. Зазелянелі на дрэвах лісточкі.*

– Які тэкст вам больш спадабаўся? Чаму? *(Тэкст ажыў, з'явіліся дзеянні.)* Якія словы ўтварылі такія змяненні?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

– Якую ролю адыгрываюць дзеясловы ў мове? *(Робяць мову больш дакладнай, падзеі жывымі, а прадметы рухомымі.)*

– Якую ролю выконваюць дзеясловы ў сказах. *(Выказнікі.)* Падкрэсліце дзеясловы як члены сказа.

**3.1. Работа з правілам с. 96.**

**3.2. Работа з рубрыкай «Завяжы вузялок».**

**Фізкультхвілінка.**

– Назавіце дзеясловы-рухі, якія мы рабілі, каб Дзед-барадзед запомніў фізкультхвілінку.

**V. Замацаванне вывучанага.**

**5.1. Работа з дэфармаванымі сказамі** (практ.167).

– Дзед-барадзед падрыхтаваў для нас яшчэ заданне: пераблытаў словы. Трэба скласці сказы правільна. *(Работа ў парах з узаемаправеркай).*

**5.2. Пісьмо па памяці (практ.169).**

– Напішам ліст Дзеду-барадзеду.

**5.3. Работа з фразеалагізмамі** *(на дошцы).*

– Дзед-барадзед любіць ужываць у сваёй мове ўстойлівыя словазлучэнні. Ці ведаеце вы іх значэнне?

*Мой сябар ведаў лес як свае пяць пальцаў.*

*Руплівы гаспадар ніколі не спіць у шапку.*

– Растлумачце сэнс фразеалагізмаў. Выпішыце дзеясловы, пастаўце да іх пытанні.

**5.4. Займальная хвілінка ад Дзеда-барадзеда.**

– Паслухайце верш «Небыліца» *(У. Карызна):*

*Сёння хмара ў хату ўбегла,*
*На засланы ложак легла,*
*Хлеб змахнула са стала,*
*Стол булёнам заліла.*
*Парассыпала скрозь смецце –*
*І зваліла ўсё на Пецю* [15, с. 241].

– Як выдумаеце, хто натварыў столькі спраў у хаце Дзеда-барадзеда?

**VI. Вынікі ўрока. Тэст «Так ці не».**

- Дзеясловы адказваюць на пытанні *хто?* або *што?*
- Дзеясловы абазначаюць дзеянні прадметаў.
- Дзеясловы адказваюць на пытанні *што рабіць? што зрабіць?*
- У сказах дзеяслоў часцей бывае дзейнікам.
- У сказах дзеяслоў часцей бывае выказнікам.

**VII. Рэфлексія.**

– Вызначце пры дапамозе дзеясловаў уражанні ад сваёй працы на ўроку і падзяліцеся імі з Дзедам-барадзедам. (Вучыліся, размаўлялі, слухалі, стараліся, дапамагалі, адказвалі, запаміналі, жадалі і г. д.) Дзякуй вам за плённую працу!

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 170.

## Адзіночны і множны лік дзеясловаў

***Мэта:*** азнаямленне са змяненнем дзесловаў па ліках.
**Задачы:**
- вучыць вызначаць лік дзеясловаў; правільна ўжываць яго формы;
- развіваць лагічнае мысленне, вобразнае ўяўленне, граматычны лад маўлення вучняў, памяць, уменне аналізаваць;
- выхоўваць настойлівасць, стараннасць, добразычлівыя адносіны да людзей.

***Абсталяванне:*** падручнік, карткі са словамі *камень, слова* (для дошкі), прадметныя малюнкі *бяроза, бярозкі* (для дошкі), выявы смайлікаў (для рэфлексіі).

### *Ход урока*

**І. Арганізацыйны момант.**

**1.1. Прыём-разважанне «Кінуты камень».**

КАМЕНЬ ----------- СЛОВА

– Прачытайце словы. Што ў іх агульнага? (*Любое слова падобна каменю, кінутаму ў ваду, выклікае хвалі думак, разважанняў, спрэчак.)*

**ІІ. Праверка дамашняга задання.** Практ. 175.

**2.1. Гульня «Хлопчыкі–дзяўчынкі».**

Хлопчыкі называюць дзеясловы, якія адказваюць на пытанне *што зрабіў? (Страсянуў, лінуў, учыніў, здагадаўся.)*

Дзяўчынкі называюць дзеясловы, якія адказваюць на пытанне *што робіць? (Ганяе, вандруе, гуляе.)*

**2.2. Індывідуальная работа па картках.**

Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце дзеясловы.

Гром гр..міць, п..гражае,
На ..сё ж..вое страх н..ганяе.

**Пальчыкавая гімнастыка.**

**ІІІ. Арфаграфічная размінка. Хвілінка чыстапісання.**

*б/д б/д*

*абрасці падрасці смяяцца адцвітаць*

– Якое слова лішняе? Чаму? *(Смяяцца, астатнія словы з прыстаўкамі.)* Як пішуцца прыстаўкі *аб, ад, пад*? Падбярыце да слова *смяяцца* аднакаранёвыя словы. *(Смех, смешны, усміхнуцца.)*

**ІV.Этап вывучэння новага матэрыялу.**

На дошцы словы: *звініць, чытаюць, плыве, гуляюць.*

– Што аб’ядноўвае гэтыя словы? *(Дзеясловы.)* Што такое дзеяслоў?

– Падзяліце словы на 2 групы:

*група 1: плыве, звініць;*

*група 2: чытаюць, гуляюць.*

– Чаму так падзялілі? *(У першай групе дзеясловы азначаюць дзеянні аднаго прадмета, у другой групе – некалькіх прадметаў.)*

– Сфармулюйце тэму ўрока. На якое пытанне адказваюць дзеясловы адзіночнага ліку? *(Што робіць?)* Дзеясловы множнага ліку? *(Што робяць?)*

– Разгледзім малюнкі *(на дошцы або экране)*:

бяроза бярозы

– Складзіце сказы па малюнках і запішыце іх.

*Малюнак 1. Каля школы расце вялікая бяроза.*

*Малюнак 2. Каля школы растуць вялікія бярозы.*

– Што змянілася ў запісы дзеясловаў? Чаму? Якое адкрыццё мы зрабілі? Праверым, ці супадаюць нашы адкрыцці з правілам у падручніку (с. 101).

**Фізкультхвілінка.**

**V. Замацаванне вывучанага.**

**5.1. Калектыўная работа** (практ. 177, абазначыць лік дзеясловаў).

**5.2. Конкурс «Шыфроўшчыкі».** Практ. 178. Расшыфруйце скорагаворку, навучыцеся яе хутка вымаўляць.

*Лета, ліпень. Лінуў лівень. Пахнуць ліпы і маліны.*

– Знайдзіце дзеясловы, вызначце іх лік.

**5.3. Работа ў парах. Гульня «Хто хутчэй».**

– Утварыце ад назоўнікаў аднакаранёвыя дзеясловы: варыянт 1 – адзіночнага ліку, варыянт 2 – множнага ліку.

*Пісьмо – піша, пішуць.*

*Бег, гульня, крык, свіст, корм, хадзьба, малюнак.*

**5.4. Самастойная работа «Аднаві прыказкі» (практ. 182).**

– Знайдзіце словы з супрацьлеглым значэннем. Вызначце лік дзеясловаў.

**5.5. Гульня «Хітры дзеяслоў».**

– Запішыце сказ пад дыктоўку. Падкрэсліце галоўныя члены сказа. Разбярыце па часцінах мовы.

*Белае пакрывала снегу пакрывала палі.*

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**6.1. Гульня «Верым – не верым».** Ці верыце вы, што

– дзеясловы абазначаюць прыметы прадметаў?

– слова *вучэнне* з'яўляецца дзеясловам?

– дзеясловы змяняюцца па ліках?

– дзеясловы ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку?

– дзеясловы ў сказах часцей за ўсё з'уляюцца выказнікамі?

– дзеясловы могуць ужывацца ў пераносным значэнні?

**VII. Рэфлексія. Гульня «Мой куток».** У кутках класа вісяць смайлікі: «радасць», «сум», «абыякавасць», «здзіўленне». Кожны вучань выбірае той куток, які адпавядае яго эмацыянальнаму стану.

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 183, спісаць з рашэнннем арфаграфічных задач, абазначыць лік дзеясловаў.

# Час дзеясловаў

***Мэта:*** азнаямленне з часам дзеясловаў.

***Задачы:***

- практыкаваць у вызначэнні часу дзеяслова па пытаннях і значэнні;
- адпрацоўваць уменне ўтвараць часавыя формы дзеясловаў;
- развіваць лагічнае мысленне, назіральнасць;
- узбагачаць слоўнік дзеясловамі-сінонімамі;
- выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі для гульні «Перакладчыкі» (для работы ў парах), карткі з дзеясловамі-сінонімамі (для вучняў), сігнальныя карткі: «адзіночны лік», «множны лік» (для вучняў), карткі з вершам для гульні «Хто хутчэй» (для вучняў).

***Ход урока***

**I. Арганізацыйны момант.**

*Настаўнік просіць зручней уладкавацца і паўтараць разам з ім.*

– Пачынаецца ўрок роднай мовы. Увага мая расце. Памяць становіцца лепшай. Я гатовы да плённай работы.

**1.1. Гульня «Перакладчыкі».**

Вучні ў парах перакладаюць «Слоўнік настрою», словы з рускай мовы на беларускую, і пазначаюць «+»: *радасны, лагодны, маркотны, незразумелы, урачысты.*

**II. Праверка дамашняга задання.**

**2.1. Гульня «Сігнальшчыкі».**

Настаўнік паказвае дзеясловы, запісаныя на дошцы або на картках. Дзеці моўчкі падымаюць сігнальныя карткі: адзіночны або множны лік.

*Размаўляе, крочыць, бягуць, ідзе, вучацца, сядзіць, ходзяць, клюе, вудзіць.*

**2.2. Індывідуальная работа па картках.**

– Да дзеясловаў з левага слупка падбярыце словы-сінонімы з правага слупка. З адным са слоў-сінонімаў складзіце сказ.

| | |
|---|---|
| ствараюць | размаўляюць |
| ідуць | нясуцца |
| бягуць | крочаць |
| гутараць | робяць |

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**3.1. Хвілінка чыстапісання. Моўная размінка.**

*Пп ппп Пп ппп*

*перапіс запіс пісьменнік*

– Да якой часціны мовы адносяцца гэтыя словы? Утварыце ад іх дзеясловы. Складзіце сказ з прапанаваных слоў і падкрэсліце граматычную аснову: *Насельніцтва, дапамог, даведацца, аб, перапіс, жыхароў, у, Беларусі, колькасці.*

– Хто ведае, калі праводзіцца перапіс насельніцтва? *(Кожныя 10 гадоў: 2009 г., 2019 г.)*

**3.2. Бліц-апытванне « Я ведаю»:**

•Што такое дзеяслоў?

•Што азначае дзеяслоў?

•На якія пытанні адказваюць дзеясловы?

•Якім членам сказа з'яўляецца дзеяслоў?

•Як змяняецца дзеяслоў? *(Па ліках.)*

•Як вы лічыце, ці ўсё мы ведаем пра дзеяслоў?

•Ці змяняецца дзеяслоў толькі па ліках? (Праблемнае пытанне.)

– Высветлім, як яшчэ змяняюцца дзеясловы.

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Работа ў групах.**

– Прачытайце сказы. У дужках напішыце пытанне да дзеяслова. Вызначце, у які момант адбываецца дзеянне адносна размовы.

Група 1. Сонца (_____?) свеціць.

У небе (_____?) лятаюць птушкі.

*(Што робіць? Што робяць? Дзеянне адбываецца ў момант размовы.)*

Група 2. (_____?) Надышла вясна.

(______?) Прыляцелі з выраю птушкі.

*(Што зрабіла? Што зрабілі? Дзеянне адбываецца да моманту размовы.)*

Група 3. Хутка (______?) зазелянее траўка.

Будуць (______) квітнець яблыні.

*(Што зробіць? Што будуць рабіць? Дзеянне адбудзецца пасля размовы.)*

– Як яшчэ змяняюцца дзеясловы? *(Па часах.)*

**Фізкультхвілінка.**

**V. Замацаванне вывучанага.**

**5.1. Работа па падручніку.** Практ. 186 (с. 106).

**5.2. Складанне міні-апавяданняў.** Практ.187 (с. 107).

– Па апорных словах складзіце невялікае апавяданне на тэму:

Група 1. «*На лясной паляне*»

*Сонца, бярозкі, песні, птушкі, траўка.*

Група 2. «*На рацэ*»

*Раніца, воблака, ветрык, вада, лодка, рыбакі, вудачкі.*

Група 3. «*Вясной у лесе*»

*Вавёрка, сарока, вожык, сонца, елка, бярозка.*

Праслухоўванне міні-апавяданняў. Вучні падкрэсліваюць дзеясловы, вызначаюць іх лік і час.

**5.3. Гульня «Хто хутчэй?».**

– Прачытайце на картцы верш А. Дзеружынскага. Знайдзіце дзеясловы, вызначце іх час.

Да ракі прыбег здалёк
Серабрысты ручаёк
І рацэ-сястры гаворыць:
Паплывём з табой да мора [18, с. 109].

**VI. Падвядзенне вынікаў урока.**

**6.1. Вучэбны дыялог «Я сцвярджаю».**

– Я сцвярджаю, што дзеясловы могуць перадаваць… (час дзеяння).

– Я сцвярджаю, што дзеясловы ў форме цяперашняга часу абазначаюць дзеянне… (якое адбываецца зараз).

**VII. Рэфлексія. Гульня «Пахвалі».**

– Пахваліце сябе за добрыя паводзіны, актыўную работу, дапамогу сябру, акуратнае пісьмо, творчасць.

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 189, вызначыць час дзеясловаў.

***Бурко Алена Аляксандраўна,***
*настаўнік пачатковых класаў*
*ДУА «Нарацкая сярэдняя школа № 2» Мядзельскага раёна*

## Правапіс НЕ з дзеясловамі

***Мэта:*** фарміраванне навыку раздзельнага напісання *не* з дзеясловамі.
***Задачы:***
- вучыць адрозніваць дзеясловы ад іншых часцін мовы;
- пазнаёміць з правілам напісання *не* з дзеясловамі;
- садзейнічаць развіццю ў вучняў лагічнага мыслення, узбагачэнню маўлення вучняў прыказкамі;
- спрыяць выхаванню працавітасці, імкнення да здаровага ладу жыцця.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная ўстаноўка (інтэрактыўная дошка) з выхадам у інтэрнэт або карткі са сказам, карткі з прыказкамі (на дошку); карткі «Часціца *не* з іншымі часцінамі мовы» (для работы ў парах); карткі з фразеалагізмамі (для работы ў парах).

### *Ход урока*

**I. Арганізацыйны момант.**

– Прачытайце на дошцы прыказкі. Якія прыказкі падыходзяць па сэнсе да ўрока? Растлумачце.

1) Хто не працуе, таму не шанцуе.
2) Работа не воўк – у лес не ўцячэ.
3) Чаго сабе не хочаш, таго і другому не жадай.
4) Чаго не ведаеш – пра тое не гавары.
5) Век жыві – век вучыся.

**II. Актуалізацыя ведаў і ўменняў.**

**2.1. Арфаграфічная размінка.** *(На дошцы.)*

– Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце.

Ш..ю выц..гнуў гусак –
Не на..івіцца ніяк.
Пагл..дзіце й вы, с..бры:
Дзеся..ь гус..нят у дв..ры
Шпарка дыбаю..ь за мамай.
А гусак шч..слівы самы. *(А. Якаўлева)* [36, с. 13]

– Як лічыце, чаму гусак шчаслівы? *(Радуецца, што тата ганарыцца сваёй сям'ёй.)* А чаму гусак выцягнуў шыю? *(Ён здзіўлены, што іх многа і хвалюецца за гусянят, пералічвае ўсіх. Гусак – клапатлівы тата.)*

**2.2. Вуснае выказванне «Парада сябру».** *(Работа ў парах.)*

– Знайдзіце дзеяслоў з часціцай *не*. Што надае яна дзеяслову? *(Адмоўнае значэнне.)* Дайце парады сваім сябрам, як трэба працаваць і паводзіць сябе на ўроку з дапамогай дзеясловаў і часціцы *не*. *(Не спяшайся, не ляніся, не шумі).*

– Вось народная парада для ўсіх: «Добры чалавек параіўшы не шкадуе». Пра што мы сёння будзем гаварыць на ўроку, хто здагадаўся? *(Вучні выказваюць свае меркаванні пра часціцу «не».)*

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**3.1. Чыстапісанне.**

*Не Не не не*

– Знайдзіце на форзацы ў канцы падручніка словазлучэнне з *не,* напісанае тлустым шрыфтам. Запішам яго ў другім радку: *не змяняецца па родах.* Як напісана часціца *не* ў словазлучэнні з дзеясловам? Чаму гэта словазлучэнне, а не сказ? Утварыце сказ з гэтым словазлучэннем, выкарыстоўваючы патрэбную схему правага форзаца падручніка. (*Прыметнікі ў множным ліку не змяняюцца па родах.)*

– Знайдзіце, як напісана часціца *не* з дзеясловам ў вершы пра гусака? (*Шыю выцягнуў гусак – не надзівіцца ніяк.* Асобна.*)* Які вывад мы зробім пра напісанне часціцы *не* са словамі? *(Вучні выказваюць свае меркаванні.)*

**3.2. Работа з правілам (с. 119).**

– Якім сказам па мэце выказвання з'яўляецца правіла? Якая ў яго мэта? *(Выказванні вучняў.)* Пераўтварыце правіла ў пытанне, параду, загад і запішыце яго, запомніце. *(Работа ў парах. Узаемаправерка.)*

**3.3. Назіранне за ўжываннем часціцы *не* з іншымі часцінамі мовы.**

– Вызначце часціны мовы. Запішыце словы ў тры слупкі: варыянт 1 – назоўнікі, варыянт 2 – прыметнікі, варыянт 3 – дзеясловы.

*Непрыемныя, непрыгожая, не прачытаў, не падам, невысокая, непагадзь, не спяшаецца, непрыкметны, незабудка, не пагуляюць, ненасытная, не пераходзь, невялікія, не вывучыла, невук.*

– Што заўважылі? З якой часцінай мовы напісалі часціцу *не* асобна?

– Што будзе галоўным сёння на ўроку? Чым мы будзем займацца на ўроку? *(Будзем адрозніваць дзеясловў ад іншых часцін мовы, знаходзіць розныя формы дзеясловаў у тэксце і тлумачыць правапіс **не** з дзеясловамі.)*

**Фізкультхвілінка.**

**IV. Замацаванне новага матэрыялу.**

**4.1. Работа з дэфармаваным сказам** *(на дошцы).*

– Інтэрактыўнае практыкаванне:

*https://learningapps.org/watch?v=pewaru0tv18.*

– Расстаўце словы па парадку, каб атрымаўся сказ.

*(Не, гарыць, Праўда, ў, вадзе, ў, агні, і, не, тоне.)*

– Знайдзіце дзеясловы. Як пішацца *не* з дзеясловамі?

**4.2. Тлумачэнне фразеалагізмаў**. *Работа ў групах. Кожная група атрымлівае асобную картку з напісаным на ёй фразеалагізмам.*

– Прачытайце. Абмяркуйце ў групе і растлумачце сэнс устойлівага выказвання. Знайдзіце дзеясловы.

*1) Куды Макар цялят не ганяў.*

*2) І вухам не вядзе.*

*3) Па слова ў кішэнь не лазіць.*

*4) Каменя на камені не пакінуць.*

– Як пішацца *не* з дзеясловам?

**4.3. Калектыўная праца з прыказкамі** *(па магчымасці на інтэрактыўнай дошцы або на картках для дошкі).*

– Злучыце пачатак і працяг прыказкі *(перацягваннем на інтэрактыўнай дошцы*). Запішыце прыказкі ў сшыткі і падкрэсліце часціцу *не.*

| | |
|---|---|
| *Хто не сее,* | *няхай людзі пахваляць цябе.* |
| *Рана не ўстанеш –* | *у таго не расце.* |
| *Не хвалі сябе,* | *многа не зробіш.* |

– Растлумачце правапіс *не* з дзеясловамі.

**4.4. Выкананне практыкавання 210 (с. 120).** *(Самастойная работа.)*

– Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс *не* з дзеясловамі.

**4.5. Выкананне практыкавання 209 (с. 119).**

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

– Як пішацца *не* з дзеясловамі? Што абазначаюць дзеясловы? На якія пытанні яны адказваюць? Які сэнс надае дзеясловам часціца *не*? *(Адмоўны.)*

**VI. Падвядзенне вынікаў.**

– Адгадайце загадку Н. Гілевіча і знайдзіце памылку: «Невялікае, без’языкае, не есць, неп’е, а гаворыць і пяе». *(Радыё.)* [5, с. 206]

**VII. Рэфлексія.** Працягні выказванне:

- Не было цяжкасцей…
- Не зразумеў адразу…
- Не разабраўся да канца…

– Што агульнага ў гэтых сказах? *(Пачынаюцца з часціцы не.)* Як пішацца *не* з дзеясловамі?

**VIII. Дамашняе заданне.** Практ. 212 с. 121, пераказваць правіла.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі ў 2019/2020 навучальным годзе адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў і правядзенні факультатыўных заняткаў пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі», зацверджаныя намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 10.07.2019.

2. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджаныя намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 06.06.2016.

3. Санитарные нормы и правила «Требования для учреждений общего среднего образования», утвержденные постановлением Министерства здравоохранения Республики Беларусь от 27 декабря 2012 г. № 206.

4. *Анцух, М.* У. Работа над памылкамі на ўроках беларускай мовы. Пачатковая школа : дапам. для вучняў агульнаадукац. установ з рус. мовай навучання / М. У. Анцух. – 3-е выд. – Мазыр : Белы Вецер, 2012. –54 с.

5. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. – Мінск : Вышэйшая школа, 1996. – 655 с.

6. Беларуская мова. 3 клас. Урок: Сінонімы / Блог Татьяны Саксон [Электронный ресурс] – Режим доступа : http://lit-dety.ru/uroki-2/bel-mova-

7. Беларуская мова. 3 клас. Урок: Правапіс не з дзеясловамі / Блог Т а т ь я н ы С а к с о н

8. Беларуская літаратура : пазакласнае чытанне / уклад. Л. І. Строк. – Мінск : Юнипресс, 2010. – 384 с. – (Хрэстаматыя).

9. *Бурлак, В.* Фантазюркі / Вера Бурлак. – Мінск : Галіяфы, 2018. – 52 с.

10. *Вітка, В.* Роднае слова : чытанка для 2-га класа школ з белар. мовай навучання / Васіль Вітка, Шаўлоўская Марыя. – 4-е выд., дапрац. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 288 с.

11. Вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. Пачатковая школа. III клас. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017.

12. *Дзеружынскі, А. С.* Залаты каласок : вершы, пацешкі, небыліцы : для малодшага школьнага ўзросту / А. С. Дзеружынскі ; мастак У. І. Сытчанка. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 302 с.

13. *Жуковіч, В. А.* Гуканне вясны : вершы, казкі, загадкі / В. А. Жуковіч; мастак А. І. Аблажэй. – Мінск : Юнацтва, 1992. – 95 с.

14. Залатая раніца : казкі, апавяданні, вершы : для дзяцей мал. шк. узросту / уклад. В. Аляксеева. – Мінск : Звязда, 2015. – 240 с. – (Школьная бібліятэка).

15. Залатыя каласкі : чытанка для дзяцей : у 2 ч. / уклад. М. А. Федасеенка [і інш.]. – Мінск : Лазурак, 1994. – Ч. 1. – 384 с.

16. Зборнік вучэбных праграм для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання. – Мінск : НІА, 2017.

17. *Леўкіна, Л. Ф.* Беларуская мова : тэсты : 3-ці клас / Л. Ф. Леўкіна. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2007. – 80 с. – (Урок у пачатковай школе).

18. *Ляшук, В. М.* Беларуская мова : 3-ці клас : рабочы сшытак : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з бел. мовай навучання / В. М. Ляшук. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2009. – 111 с. – (Рабочыя сшыткі).

19. Начальная школа. 3 класс : примерное календарно-тематическое планирование : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / М. Б.Антипова [и др.]. – Минск : НИО : Аверсэв, 2018. – 204 с.

20. *Ожегов, С. И.* Толковый словарь русского языка / С. И. Ожегов, Н. Ю. Шведова. – М. : Азъ, 1995. – 696 с.

21. *Пазнякоў, М. П.* Гульняслоў : гульні з літарамі і словамі / М. П. Пазнякоў. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2011. – 128 с.

22. *Пазнякоў, М. П.* Ехаў поўны воз дзівос : вершы, смяшынкі, лічылкі, небыліцы,скорагаворкі, загадкі : для мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 143 с.

23. *Пазнякоў, М. П.* Тры чарадзеі : вершы, скорагаворкі, загадкі : для дашк. і мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. – Мінск : Юнацтва, 1991. – 112 с.

24. Пачатковая школа. 3 клас : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / М. Б. Анціпава [і інш.]. – Мінск : НІА : Аверсэв, 2018. –

25. *Русак, А.* Мой край / Адам Русак [Электронны рэсурс]. – Рэжым

26. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га класа устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 1. – 144 с.

27. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. /. В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 144 с.

28. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : 3-ці клас : дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання /. В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Пачатковая школа, 2018. – 64 с. – (Кампетэнтнасны падыход).

29. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : 3-ці клас : рабочы сшытак : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 96 с.

30. Скарник. Русско-белорусский словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.skarnik.by/tsbm/81363. – Дата доступа :

– Знание – сила. Толковый словарь Ожегова [Электронный ресурс]. – Режім

доступа HYPERLINK "http://slovariki.org/tolko

32. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : уклад. І. Л. Капылоў [і інш.] . – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2016. – 968 с.

33. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. Начальная школа. III класс. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017.

34. *Цвірка, Е.* Птушыны хор : вершы і казкі : для мал. шк. узросту. –

35. *Шушкевіч, С.* Загадка / Станіслаў Шушкевіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.sb.by/articles/zhyvyya-staronk-uvosen-ne-tolk-padruchn-k-sshytk-prytsyagvayuts-dzyatsey-da-veda-.html – Дата доступу :

36. *Якаўлева, А. Л.* Мае сябры – басаногія вятры : вершы : для дашкольнага ўзросту / А. Л. Якаўлева. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 24 с.

Вучэбна-метадычнае выданне

# ВЫВУЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 3 КЛАСЕ

Адказны за выпуск *І. Р. Калеснікава*

Карэктары *М. С. Сікорская, Ж. М. Атаева*
Камп'ютарная вёрстка *Г. А. Абцэшка*
Дызайн вокладкі *В. А. Ніканорава*

Падпісана ў друк 17.04.2020. Фармат 60×84$^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Друк на рызографе. Заказ 11.
Ум. друк. л. 4,65. Ул.-выд. арк. 3,61. Тыраж 200 экз.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/422 ад 02.09.2014.
Вул. П. Глебкі, 88, 220104, Мінск.